Праграма тэлебачання на наступны тыдзень.

20 КАНАЛАЎ

Зямля пад жураўлінымі крыламі

СТАР. 6

Міфы аб працаздольнасці пажылых людзей

СТАР. 8

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

25 КАСТРЫЧНІКА 2013 г. ПЯТНІЦА № 202 (27567) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

РАЗАМ МЫ МАЦНЕЙ

Развіццё інтэграцыі павінна ўяўляць рух наперад у ліквідацыі любых бар'ераў

Фота БЕЛТА.

Развіццё інтэграцыі павінна ўяўляць рух наперад у ліквідацыі любых бар'ераў на шляху ўсебаковага ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва. Пра гэта заявіў учора Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на пасяджэнні Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета, якое прайшло ў Палацы Незалежнасці, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Аляксандр Лукашэнка са шкадаваннем заўважыў, што сёння, нягледзячы на праведзеную работу, колькасць выключэнняў і абмежаванняў не зменшылася, па некаторых напрамках нават ўзрасла. «Мы не можам плённа рухацца далей, не выканаўшы нашы папярэднія дамоўленасці. Не дасягнуўшы тых прагматычных або, калі хочаце, практычных мэт інтэграцыі, пра якія мы неаднаразова заяўлялі», — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі. Кіраўнік беларускай дзяржавы адзначыў, што асноўным пытаннем пасяджэння з'яўляецца падрыхтоўка праекта дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе. «Ад таго, які дагавор мы створым, будзе залежаць і поспех нашага новага інтэграцыйнага аб'яднання, і яго прывабнасць для іншых краін», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. На яго думку, гэта наўпрост паўплывае на развіццё ўзаемаадносін паміж дзяржавамі вялікага рэгіёна.

Беларускі Прэзідэнт упэўнены, што не варта баяцца перадачы дадатковых паўнамоцтваў у Мытным саюзе на наднацыянальны ўзровень. «Суверэнітэт — не ікона. Усё мае сваю цану. І калі мы хочам жыць лепш, то трэба недзе саступіць, нешта ахвяраваць. Галоўнае — гэта дабрабыт людзей», — лічыць беларускі лідар. На думку Прэзідэнта Беларусі, тое ж тычыцца і архітэктуры будучага саюза — структуры органаў і механізмаў прыняцця рашэнняў. «Гэтыя кампаненты павінны быць зразумелымі, аптымальнымі і, галоўнае, — эфектыўнымі», — падкрэсліў кіраўнік беларускай дзяржавы, дадаўшы, што функцыі камісіі *(Еўразійскай эканамічнай камісіі.* — **Заўвага БЕЛТА***)* не павінны размывацца.

«Мы ствараем не міждзяржаўнае ўтварэнне, а сумесны орган дзяржаўнага кіравання, які павінен прымаць рашэнні кожны дзень. І гэтыя рашэнні павінны выконвацца на ўсёй тэрыторыі нашага саюза», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Прэзідэнт Беларусі лічыць сімвалічным, што ў Мінску атрымліваюць пуцёўку ў жыццё найбольш важныя інтэграцыйныя рашэнні. Так, з прыняццем у лістападзе 2009 года ў беларускай сталіцы Мытнага кодэкса і Адзінага мытнага тарыфу пачалося практычнае функцыянаванне Мытнага саюза Беларусі, Казахстана і Расіі.

«У кожнага партнёра, вядома ж, сваё бачанне перспектыў. Гэта нармальна. Аднак мы абавязаны знайсці тыя рашэнні, якія задавальняюць усіх. На наш погляд, гэта магчыма», — адзначыў беларускі лідар.

Беларусь, безумоўна, вітае далучэнне да Мытнага саюза новых партнёраў. Гэта робіць яго больш устойлівым. Таму дзверы ў наша аб'яднанне заўсёды адкрыты і для іншых краін», — сказаў беларускі лідар». Мы бачым намер Арменіі далучыцца да нашага інтэграцыйнага аб'яднання. Аднак трэба дакладна разумець, што Арменіі і іншым неабходна прарабіць той жа шлях інтэграцыі, які ўжо прайшлі Беларусь, Казахстан і Расія, і прыняць на сябе ўсе абавязацельствы ў поўным аб'ёме без усялякіх выключэнняў».

Што тычыцца Украіны, то Прэзідэнт Беларусі падкрэсліў важнасць таго, каб яна, рухаючыся ў бок ЕС, не закрыла для сябе магчымасць удзелу ў Мытным, а ў далейшым — і ў Еўразійскім эканамічным саюзе. «Гэта няпростыя пытанні. Па іх нам трэба будзе знайсці ўзважаныя рашэнні, — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы. — Мы павінны даць выразны сігнал нашым урадам, у якім кірунку ім рухацца далей». «Як прапанаваў Нурсултан Абішавіч Назарбаеў, па тых спрэчных пытаннях, якія ў нас, безумоўна, ёсць, трэба не хапаць адзін аднаго за грудкі і трэсці, а даручыць спецыялістам, урадам у сцісłыя тэрміны, каб не парушаць нашых дамоўленасцяў па далейшым руху наперад, выпрацаваць прымальныя рашэнні, магчыма, на падставе кампрамісаў», — сказаў Прэзідэнт Беларусі.

Прэзідэнт Беларусі запрасіў калег выказацца па актуальных пытаннях інтэграцыі.

Прэзідэнт РФ Уладзімір Пуцін заявіў, што Расія гатова да самага цеснага інтэграцыйнага ўзаемадзеяння. Паводле яго слоў, на фоне агульнага запаволення тэмпаў росту ў свеце макраэканамічныя паказчыкі ў «тройцы» выглядаюць дастаткова прымальна. «Крызісныя з'явы ў сусветнай эканоміцы, вядома, не абышлі бокам і нашы дзяржавы, але, каб пераадолець іх, неабходна і далей умацоўваць інтэграцыю, удасканальваць наш агульны рынак тавараў і паслуг, паляпшаць умовы вядзення бізнесу», — адзначыў расійскі Прэзідэнт. «Расія выходзіць менавіта з такой логікі і гатовая да самага цеснага ўзаемадзеяння», — падкрэсліў Уладзімір Пуцін.

«Тое, што мы пакуль не дасягнулі па некаторых пазіцыях таго, аб чым дамаўляліся раней, вядома, сумна, я тут згодны з калегамі, трэба ў гэтым кірунку рухацца і дамагацца тых мэт, якія мы перад сабой паставілі. Як мы дамаўляліся на сустрэчы ў Астане, трэба, безумоўна, працаваць над ліквідацыяй выключэнняў і нейкіх узаемных прэферэнцый. Трэба ствараць роўныя ўмовы, — заявіў Уладзімір Пуцін. — Гэта вялікая праца, але яна павінна быць з двухбаковым рухам. Павінен быць кампраміс».

Па словах расійскага Прэзідэнта, неабходна весці гаворку аб стварэнні еўразійскіх сетак у сферах энергетыкі, транспарту, тэлекамунікацый. «Такое збліжэнне забяспечыць самыя спрыяльныя ўмовы для развіцця патэнцыялу нашых эканомік. Наўрад ці ў каго ёсць сумненні, што рэгіянальная інтэграцыя (увесь свет ідзе па гэтым шляху) — найбольш дзейсны сродак для максімальнага выкарыстання ўнутраных рэсурсаў росту, павышэння канкурэнтаздольнасці на сусветных рынках. Разам мы мацней і нам прасцей рэагаваць на глабальныя выклікі», — упэўнены Уладзімір Пуцін.

«Толькі што гаварылася, што мы павінны вельмі акуратна падыходзіць да пашырэння нашага саюза. Цалкам з гэтым згодны. І ўмовы павінны быць для ўсіх аднолькавыя. Мы ў вузкім складзе пра гэта казалі і пагадзіліся з гэтай пазіцыяй», — адзначыў Прэзідэнт Расіі. Гаворачы пра цікавасць трэціх краін да супрацоўніцтва з Мытным саюзам, Уладзімір Пуцін адзначыў, што цікавасць праяўляе буйная сусветная эканоміка — Індыя. На думку расійскага Прэзідэнта, улічваючы аб'ёмы і маштабы індыйскага рынку, перспектывы развіцця Азіі ў цэлым, бакам неабходна паставіцца да гэтай прапановы самым сур'ёзным чынам.

Прэзідэнт Казахстана Нурсултан Назарбаеў прапанаваў прыняць Турцыю ў Мытны саюз, заявіў ён на пасяджэнні.

«Чуў, ужо шмат хто кажа, што, напрыклад, Сірыя хоча ўступіць *(у Мытны саюз.* — **Заўвага БЕЛТА***)*. Прэм'ер-міністр Турцыі Эрдаган звярнуўся да мяне: ці нельга Турцыю прыняць у Мытны саюз?» — сказаў Прэзідэнт Казахстана. Нурсултан Назарбаеў станоўча адазваўся аб такой магчымасці. «Турцыя — вялікая краіна, у нас ёсць супольная мяжа. І адпала б крытыка. Куды на Захад ні паедзеш, адразу задаюць пытанне: вы ствараеце Савецкі Саюз ці нешта там ствараеце пад Расію? І даводзіцца тлумачыць, што нічога падобнага няма», — зазначыў казахстанскі лідар. «Можа быць, Турцыю прыняць — і пытанні скончацца», — прапанаваў ён.

Дарэчы, паводле яго слоў, Казахстан мае пэўныя цяжкасці пры ўступленні ў СГА з-за дамоўленасцяў у рамках Мытнага саюза. «Вельмі сур'ёзнае пытанне — гэта ўступленне Казахстана ў СГА, — сказаў Нурсултан Назарбаеў. — Мы цалкам ішлі ў фарватары Расіі, нам была абяцана падтрымка пры ўступленні ў СГА. Балійская канферэнцыя будзе сёлета ў снежні. Казахстан там мог бы ўжо ўступіць, але мы не можам, таму што падтрымалі ўзровень абароны Расіі. Гэта, напэўна, больш пытанне паміж Расіяй і Казахстанам, але гэта тычыцца і Беларусі».

Ён таксама адзначыў наяўнасць недахопаў у рабоце Еўразійскай эканамічнай камісіі. «Назіраецца відавочная палітызацыя работы камісіі, распыленне сродкаў і намаганняў на паглыбленне інтэграцыйных працэсаў», — заявіў Прэзідэнт Казахстана. Нурсултан Назарбаеў канстатаваў, што незалежна ад наяўнасці нявырашаных пытанняў і задач адбываюцца спробы штучна падштурхнуць працэс: «Давайце зробім тое, пра што мы дамовіліся, а потым ужо будзем глядзець далей». «Таму нельга дапускаць з боку камісіі парушэнняў прынцыпаў рэгламенту работы. Нярэдка дакументы камісіі паступаюць на ўзгадненне за адзін дзень да прыняцця рашэння. Не магу не адзначыць, што расійскія члены Калегіі прымаюць удзел у пасяджэннях урада Расіі і атрымліваюць адпаведную ўстаноўку, хаця, згодна з нашым дагаворам, Камісія, члены Калегіі не падсправаздачны ніякаму з нашых урадаў», — заўважыў Нурсултан Назарбаеў.

«Трэба завяршыць работу над ужо падпісанымі дагаворамі. Па транспартаванні нафты і газу падпісалі — не вырашаецца, па чыгуначных тарыфах не вырашаецца, па электраэнергіі не вырашаецца. Давайце засяродзімся на гэтым. Не выканаўшы тое, пра што мы дамовіліся, — крочыць далей? Хто нас гоніць? Час ёсць», — лічыць казахстанскі лідар.

Прэзідэнты мытнай «тройкі» таксама заявілі аб неабходнасці захаваць частку нарматыўнай базы ЕўрАзЭС. Тут ёсць некалькі дзясяткаў міжнародных дагавораў, якія тычацца членаў мытнай «тройкі». Казахстанскі лідар у гэтай сувязі прапанаваў падоўжыць іх дзеянне, адаптаваць да Мытнага саюза альбо прыняць нанова.

«Ставіцца пытанне, што будзе з членамі гэтай арганізацыі *(ЕўрАзЭС.* — **Заўвага БЕЛТА***)*, куды ўваходзяць таксама Кыргызстан і Таджыкістан. Трэба дамовіцца. Можа, яны будуць назіральнікамі, калі мы не хочам нейкім чынам вызначыць іх статус».

Што тычыцца далейшага лёсу ЕўрАзЭС, Уладзімір Пуцін пагадзіўся з пазіцыяй Прэзідэнта Казахстана і падкрэсліў недапушчальнасць страты нарматыўна-прававога падмурка, на якім у тым ліку стаіць Мытны саюз. «Мы не можам проста так ліквідаваць ЕўрАзЭС, інакш мы падарвем прававую аснову Мытнага саюза», — сказаў Прэзідэнт Расіі.

ЦЫТАТА ДНЯ

Георгій ГРЫЦ, намеснік старшыні Беларускай навукова-прамысловай асацыяцыі:

«Саміты кіраўнікоў дзяржаў СНД, якія праходзяць у Мінску, лічу, стануць сапраўды лёсавызначальнымі. Гэта свайго роду аб'яднанне супрацьлегласцяў. Саміт — добрая магчымасць зверыць гадзіннікі і паспрабаваць знайсці баланс інтарэсаў. Гэта вельмі важна. І нават калі за гэтыя два дні не атрымаецца вырашыць усе існуючыя пытанні, падчас самітаў будуць закрануты інтарэсы і Беларусі, і Расіі, і Казахстана. Ускосна, на маю думку, можа быць закранута і пытанне Украіны: Украіна — ЕС або Украіна — АЭП».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 25.10.2013 г.

Долар ЗША	9160,00	▲
Еўра	12620,00	▲
Рас. руб.	289,50	▲
Укр. грыўня	1121,66	▲

■ Надвор'е

НЕКАЛЬКІ ДЗЁН АНАМАЛЬНАЙ ЦЕПЛЫНІ

На выхадныя тэмпературны фон будзе на 5-10 градусаў вышэй за норму.

Напрыканцы тыдня на тэрыторыю Беларусі завітае даволі цёплае паветра з боку паўднёвага захаду Еўропы. Таму ў пятніцу пры павышаным атмасферным фоне істотных ападкаў у краіне не чакаецца, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга Фядотава.

Максімальная тэмпература паветра ўдзень 9-15 градусаў. На наступны дзень да нас «зацягне» невялікі атмасферны фронт. Тэмпература паветра ўначы на суботу плюс 2-8 градусаў, па паўднёвым захадзе Брэсцкай вобласці да 10 цяпла, удзень — 9-15, а па паўднёвым захадзе Беларусі — плюс 9-17 градусаў. У нядзелю пад уплывам зоны паніжанага атмасфернага ціску ўначы ў паўночных і цэнтральных раёнах, а ўдзень месцамі невялікія дажджы. Уначы на нядзелю тэмпературны фон павялічыцца да 7-12 цяпла, удзень чакаецца ўжо 12-17 градусаў вышэй за нуль.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных сіноптыкаў, захаваецца анамальна цёплае надвор'е і на пачатку наступнага тыдня.

Сяргей КУРКАЧ.

■ Парламенцкі дзённік

ПАДТРЫМАЦЬ І НЕ СТРАЦІЦЬ

На ўчарашнім пасяджэнні трэцяй сесіі Палата прадстаўнікоў разгледзела блок законапраектаў у эканамічнай сферы. Сярод іх: Дэкрэт № 5, які карэкціруе леташні Дэкрэт № 6 аб стымуляванні прадпрымальніцкай дзейнасці на тэрыторыі сярэдніх, малых гарадскіх паселішчаў і сельскай мясцовасці; змяненні ў закон аб банкруцтве; праект закона аб супрацьдзеянні манапалістычнай дзейнасці і змены ў закон аб натуральных манаполіях.

«Зарабляем — і цудоўна»

— Галоўны напрамак дэкрэта аб стымуляванні прадпрымальніцкай дзейнасці на тэрыторыі сярэдніх, малых гарадоў і сельскай мясцовасці застаецца ранейшым, — патлумачыў журналістам **Міністр эканомікі Беларусі Мікалай СНАПКОЎ.** — Развіццё малога і сярэдняга бізнесу, развіццё канкрэтных вытворчасцяў, якія вырабляюць прадукцыю і аказваюць паслугі ў рэгіёнах, захоўваецца. Аднак практыка прымянення дэкрэта паказвае, што льготы, якія распаўсюджваюцца на ўвоз тэхнікі, ствараюць умовы несправядлівай канкурэнцыі для тых беларускіх прадпрыемстваў, якія вырабляюць аналагічную тэхніку. У сваёй аснове карэкціроўкі накіраваны на выключэнне атрымання мытных льгот для тых відаў тэхнікі, якія вырабляюцца ў нашай краіне, і на канцэнтрацыю намаганняў па стварэнні рэальных вытворчасцяў у сельскай мясцовасці і малых гарадах.

Міністр эканомікі расказаў дэпутатам пра вынікі прымянення Дэкрэта № 6 ад 7 мая 2012 года, які ён назваў беспрэцэдэнтным з пункту погляду льгот для арганізацыі ўласнага бізнесу ў сярэдніх, малых гарадах і сельскай мясцовасці. Ён нагадаў, што гэты дэкрэт накіраваны перш за ўсё на развіццё канкурэнтаздольнасці рэгіёнаў, рызыка развіцця якіх з'яўляецца сёння сумнай рэальнасцю. Па падліках галоўнага эканамічнага ведамства краіны, да 2032 года больш за 40% раёнаў Беларусі будуць мець колькасць насельніцтва менш за 20 тысяч чалавек, што ставіць пад сумненне магчымасць нармальнага іх функцыянавання.

Менавіта таму апошнім часам урад і Міністэрства эканомікі прыкладаюць усе намаганні для развіцця бізнесу менавіта ў рэгіёнах. За невялікі прамежак часу, які прайшоў пасля прыняцця Дэкрэта №6, колькасць суб'ектаў гаспадарання, зарэгістраваных на тэрыторыі малых гарадскіх паселішчаў і сельскай мясцовасці, узрасла на 14 тысяч адзінак (або на 15%). У той жа час у буйных гарадах гэты паказчык вырас усяго на 6%. Пры гэтым у рэгіёнах расце колькасць менавіта камерцыйных прадпрыемстваў, на што і быў накіраваны дэкрэт. Трохі больш чым за год у малых гарадах і сельскай мясцовасці было створана каля 80 тысяч новых працоўных месцаў. Для параўнання, падчас 3-гадовага дзеяння паскоранай індустрыялізацыі ў Казахстане было створана толькі 36 тысяч новых працоўных месцаў.

У 2012 годзе сума падатковых льгот у рамках Дэкрэта № 6 склала 70 млрд рублёў, пры гэтым у бюджэт было пералічана больш за 132 млрд рублёў. Гэта значыць, што аддача ад стымулявання прадпрымальніцтва ў рэгіёнах перавышае выдаткі дзяржавы, чаго няма на многіх дзяржаўных прадпрыемствах, калі выдаткі на іх падтрымку перавышаюць тыя сумы, якія яны адлічваюць у бюджэт, заўважыў міністр эканомікі. Прымяненне Дэкрэта № 6 садзейнічала і росту прамых замежных інвестыцый у асноўны капітал, агульная сума якіх склала 2,8 трл рублёў. З іх 2,5 трл — за кошт грузавога транспарту. «Гэта, у прынцыпе, той нюанс, тая супярэчлівасць, з-за якой і ўнесены Дэкрэтам №5 змены ў Дэкрэт №6, якія датычацца ў асноўным грузавога транспарту», — сказаў дэпутатам Мікалай Снапкоў.

СТАР. 2

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

У ЕС ЗА РЫСАЙ БЕДНАСЦІ ЖЫВУЦЬ 84 МЛН ЧАЛАВЕК

У Еўрасаюзе за мяжой беднасці жывуць каля 84 млн чалавек, што складае амаль 17% ад усяго насельніцтва краін, якія ўваходзяць у саюз. Пра гэта паведаміла прэс-служба Еўракамісіі. Паводле ацэнак ЕК, працэс выхаду Еўропы з крызісу можа зацягнуцца на бліжэйшыя 10 гадоў. Сёння 26 млн чалавек у Еўрасаюзе з'яўляюцца беспрацоўнымі. «У некаторых найбольш пацярпелых ад крызісу краінах мы бачым рост экстрэмізму, дэмагогіі і забабонаў. Стымулюючы эканамічны рост, нельга забываць пра рост справядлівасці», — заявіў Лука Джахер, старшыня Еўрапейскага сацыяльна-эканамічнага камітэта. На думку экспертаў, фінансавы і эканамічны крызіс у ЕС перарос у крызіс сацыяльны і дэмакратычны. З гэтым звязаны таксама крызіс даверу да ЕС у цэлым. Паводле статыстыкі, цяпер толькі 31% насельніцтва Еўрасаюза верыць у ідэі аб'яднання.

У ЗША ПАЛІЦЭЙСКІЯ ЗАСТРЭЛІЛІ ПАДЛЕТКА З ЦАЦАЧНЫМ АЎТАМАТАМ

У ЗША паліцэйскія застрэлілі 13-гадовага падлетка, прыняўшы цацачны аўтамат у яго руках за сапраўдны, паведамляюць інфармагенцтвы. Двое паліцэйскіх, якія патрулявалі раён у горадзе Санта Роуз (штат Каліфорнія), здалёк убачылі хлопчыка, які трымаў у руках цацачны аўтамат. Адзначаецца, што супрацоўнікі праваахоўных органаў не зразумелі, што чалавек з аўтаматам — дзіця. Па адной з версій, паліцыянты запатрабавалі, каб Круз (так звалі хлопчыка) кінуў зброю на зямлю. Аднак, не чакаючы рэакцыі падлетка, адзін са служыцеляў закона адкрыў агонь. Па іншай версіі, паліцыянты загадалі падлетку пакласці зброю двойчы. Але, па іх словах, хлопчык толькі павярнуўся ў іх бок і пачаў падымаць зброю. Паліцэйскі быў вымушаны адкрыць агонь. Ад атрыманых раненняў падлетак памёр на месцы.

У ІНДАНЕЗІІ ТЫСЯЧЫ ЧАЛАВЕК ЭВАКУІРАВАНЫ З-ЗА ВЫВЯРЖЭННЯ ВУЛКАНА

У Інданезіі ў чацвер пачалося вывяржэнне вулкана Сінабунг у правінцыі Паўночная Суматра. Гара выкінула слуп чорнага попелу, які дасягнуў трох кіламетраў у вышыню. Апусціўшыся, ён тоўстым пластом пакрыў бліжэйшыя вёскі і фермы, паведамляе The Jakarta Globe. «Першае вывяржэнне адбылося прыкладна ў гадзіну ночы, другое — каля 4 гадзін раніцы», — цытуе выданне паведамленне Нацыянальнага агенцтва па прадухіленні і ліквідацыі наступстваў стыхійных бедстваў. Паведамленняў аб загінулых або пацярпелых не паступала. Як перадае ABC News, улады эвакуіравалі больш за 3300 чалавек, якія жылі па суседстве з гарой у раёне Каро. Чыноўнікі таксама заклікалі турыстаў трымацца далей ад небяспечнай зоны і не набліжацца да вулкана бліжэй, чым на 1,5 км.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

КАВАМАНЫ РАДЗЕЙ ХВАРЭЮЦЬ НА РАК ПЕЧАНІ

Калі кожны дзень выпіваць па тры кубкі кавы, то можна знізіць рызыку раку печані больш чым на 50%, піша The Indian Express. У прыватнасці, кава памяншае верагоднасць развіцця гепатацэлюлярнай карцыномы (самага распаўсюджанага тыпу раку печані) прыкладна на 40%. Рак печані стаіць на шостым месцы па распаўсюджанасці сярод ракавых захворванняў у свеце. Гэта трэцяя самая частая прычына смерці ад раку. На гепатацэлюлярную карцыному прыпадае больш за 90% выпадкаў раку печані. Апошняе даследаванне ўплыву кавы на рызыку раку пацвярджае раней праведзеныя. Аўтар працы Карла Ла Векія лічыць, што пазітыўны ўплыў кавы можна часткова растлумачыць яе даказанай здольнасцю прадухіляць дыябет. А дыябет з'яўляецца ключавым фактарам рызыкі раку печані. Плюс, як вядома, кава абараняе ад цырозу і пазітыўна ўплывае на энзімы печані.

КАРАТКА

У сувязі з правядзеннем у Мінску Савета кіраўнікоў СНД 25 кастрычніка будуць уводзіцца часовыя абмежаванні руху па праспекце Незалежнасці, праспекце Пераможцаў, Мінскай кальцавой аўтадарозе, вуліцы Арлоўскай.

3, 4 і 5 студзеня ў Мірскім замку будуць арганізаваны стылізаваныя калядныя балі. Рэтрасалон у стылі джаз чакае гасцей 4 студзеня, а 5 студзеня пройдзе дзіцячы баль.

Чэмпіён Алімпійскіх гульняў 2008 года ў Пекіне па цяжкай атлетыцы беларус Андрэй Арамнаў не выступіць на чэмпіянаце свету-2013 у польскім Вроцлаве з-за пашкоджання цягліц сцягна, атрыманых на адной з апошніх трэніровак перад выездам на турнір.

Былы дырэктар ДУ « Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр гігіены» падазраецца ў прычыненні ўрону дзяржаўнаму бюджэту на суму больш як Br1 млрд.

Выбітная балерына, мастацкі кіраўнік балета Тбіліскага дзяржаўнага тэатра оперы і балета імя З. Паліяшвілі Ніна Ананіяшвілі паставіць у Мінску спектакль «Лаўрэнс» на музыку Аляксандра Крэйна. Прэм'ера намечана на кастрычнік 2014 года.

ПАДАХОДНЫ ПАДАТАК «АТРЫМАЕ» АДЗІНЫЯ ПАДЫХОДЫ

Якія даходы фізічнай асобы з'яўляюцца аб'ектам абкладання падаходным падаткам? У якіх выпадках прымяняецца вызваленне ад падаходнага падатку? Ці мае фізічная асоба права на падатковыя вылікі? На гэтыя і іншыя пытанні аб асаблівасцях падаткаабкладання даходаў фізічных асоб падатковымі агентамі на сайце БЕЛТА адказвае намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізічных асоб Міністэрства па падатках і зборах Беларусі Святлана ШАЎЧЭНКА.

— Якія змены прадугледжваюцца ў праекце закона, што ўносіць змяненні і дапаўненні ў Падатковы кодэкс у дачыненні да падаходнага падатку ў наступным годзе?

На гэты конт Святлана Шаўчэнка адзначыла, што цяпер распрацаваны законапраект, які прадугледжвае ўнясенне змяненняў і дапаўненняў у Падатковы кодэкс, якія тычацца ў тым ліку падаходнага падатку. У выпадку яго прыняцця гэтыя змены ўступяць у сілу з 1 студзеня 2014 года. Згодна з праектам прапануецца ўстанавіць адзіныя падыходы да вызначэння падатковай базы падаходнага падатку пры атрыманні фізічнымі асобамі ад арганізацый і іншых фізічных асоб даходаў у натуральнай форме ў выглядзе капітальных пабудоў (напрыклад, у выпадку дарэння нерухомай маёмасці).

У прыватнасці, законапраектам прапануецца вызначыць, што пры атрыманні фізічнымі асобамі ад арганізацый даходаў у выглядзе капітальных пабудоў падлік падаходнага падатку будзе ажыццяўляцца, зыходзячы з кошту, вызначанага ў памеры не ніжэйшым за кошт, які ўжываецца для вылічэння падатку на нерухомасць фізічным асобам. Цяпер у такім парадку вылічваецца падаходны падатак з даходаў, атрыманых грамадзянамі ў выглядзе капітальных будынкаў ад іншых фізічных асоб.

Прапануецца таксама ўдасканаліць парадак падаткаабкладання даходаў, атрыманых фізічнымі асобамі па аперацыях з каштоўнымі паперамі і фінансавымі інструментамі тэрміновых здзелак. У прыватнасці, у артыкуле 160 Падатковага кодэкса дадзены азначэнні фінансавага інструмента тэрміновых здзелак, вытворных фінансавых інструментаў, а таксама вызначана, што прызнаецца даходамі па аперацыях з каштоўнымі паперамі, базісным актывам фінансавых інструментаў тэрміновых здзелак і выдаткамі па такіх аперацыях, рэгламентаваны парадак вызначэння падатковай базы і ўдакладнены парадак вылічэння і выплаты падаходнага падатку па такіх аперацыях.

СТАР. 2

ПАДТРЫМАЦЬ І НЕ СТРАЦІЦЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Міністр падкрэсліў, што прадпрыемствы на тэрыторыях малых і сярэдніх гарадоў сапраўды ствараюцца, бо выдача сертыфікатаў уласнай вытворчасці ўзрасла там з ліпеня мінулага года ўдвая. Увезены ў краіну грузавы аўтатранспарт часцей за ўсё выкарыстоўваецца для ажыццяўлення міжнародных перавозак. «Так, гэта ёсць, — пацвердзіў Мікалай Снапкоў і дадаў: — Што станоўча адбіваецца на экспарце паслуг, да таго ж падаткі, незалежна ад таго, дзе працуе гэты транспарт, выплачваюцца на тэрыторыі, дзе зарэгістравана прадпрыемства». Міністр заўважыў, што экспарт такіх паслуг павялічыўся на 13%. На фоне адмоўнага сальда па экспарце тавараў, рост экспарту паслуг стварае неабходны баланс і з'яўляецца важным для эканомікі краіны. Зрэшты, не так важна, дзе мы зарабляем грошы, зарабляем — і цудоўна, сказаў міністр эканомікі.

Адказваючы на пытанне журналістаў, наколькі верагодна паўтарэнне ў Беларусі крызісу ўзору 2011 года, міністр эканомікі прызнаў, што, улічваючы паказчыкі плацежнага балансу і экспарту, некаторыя эксперты агучваюць такую верагоднасць. «Але яна выключана абсалютна», — падкрэсліў Мікалай Снапкоў.

Банкруцтва без абсурду

Папраўкі ў закон «Аб эканамічнай неплацежаздольнасці (банкруцтве)», які Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі прыняла ўчора ў першым чытанні, накіраваны на тое, каб працэс банкруцтва павялічыў шанцы на вяртанне грошай.

У прыватнасці, дакумент прадугледжвае, што маёмасць даўжніка, якая стала прадметам таргоў, можа быць прададзена не толькі аднаму ўдзельніку аўкцыёна, які падаў заяву на такі ўдзел, але і адзінаму, хто з'явіўся. Акрамя таго, плануецца ўвесці новы парадак змянення пачаткавай цаны маёмасці даўжніка, выстаўленай на паўторныя таргі. Яна можа быць зніжана па хадайніцтве гаспадарчага суда. Зніжэнне можа быць не больш чым на 10 працэнтаў без згоды сходу (камітэта) крэдытораў, не больш чым на 50 працэнтаў — са згоды такога сходу як пры другіх, так і трэціх паўторных таргах. Больш чым на 50 працэнтаў — таксама са згоды сходу ў выпадку, калі таргі праводзяцца чацвёрты раз і больш.

Яшчэ адна навела — выключэнне крэдыторскай запазычанасці са складу маёмаснага комплексу прадпрыемстваў-даўжнікоў пры правядзенні таргоў.

— Праект закона ўвязаны з удзелам Беларусі ў Адзінай эканамічнай прасторы, ён гарманіруе з аналагічнымі законамі ў Казахстане і Расіі, але яго прыняцце не значыць, што змен больш не будзе, бо, напрыклад, у Расіі сёлета шэсць разоў уносіліся змены ў закон аб банкруцтве, — пракаментаваў дакумент журналістам **Мікалай КАЛТУНОЎ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па эканамічнай палітыцы**. — Законапраект накіраваны на тое, каб маёмасць даўжніка была прададзена як мага больш хутка па максімальна высокім кошце. Бо асноўныя сродкі рэгулярна індэксуюцца і з цягам часу прадаць іх аказваецца немагчыма, а значыць, і вярнуць грошы даўжніка. Каб выключыць сітуацыю абсурду, калі ўстарэлае каштуе больш за новае, мы і прынялі гэты дакумент.

З ЛПП — датэрмінова

Вялікую дыскусію ў Авальнай зале Палаты прадстаўнікоў выклікалі змены ў законы, якія тычацца накіравання грамадзян у лячэбна-прафілактарыі і ўмоў знаходжання ў іх. Падрыхтаваны Міністэрствам унутраных спраў законапраект мае пяць асноўных навацый. Прапануецца накіроўваць у ЛПП замежнікаў і асоб без грамадзянства, калі яны пастаянна пражываюць на тэрыторыі Беларусі. Спрашчаецца накіраванне ў ЛПП грамадзян, якія абавязаныя вяртаць дзяржаве сродкі на ўтрыманне іх дзяцей. Міністэрству ўнутраных спраў даецца права выдаваць правілы ўнутранага распарадку ў ЛПП. З'яўляецца магчымасць скарачэння тэрмінаў знаходжання ў прафілактарыі, калі чалавек прабыў там не менш за паўгода і на працягу 6 апошніх месяцаў не меў спагнанняў. Нарэшце, рашэнне аб спыненні знаходжання ў ЛПП у сувязі з дасягненнем пенсійнага ўзросту, выяўленнем цяжарнасці, інваліднасці 1 або 2 групы альбо пры выяўленні хваробы, якая перашкаджае знаходжанню ў ЛПП, можа прымаць не суд, як цяпер, а начальнік прафілактория.

Адным з самых вострых пытанняў, з якім дэпутаты неаднаразова звярталіся да намесніка міністра ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь Мікалая Мельчанкі, які прадстаўляў законапраект, датычылася працаўладкавання насельнікаў ЛПП. Парламентарыі настойліва рэкамендавалі міністэрству распрацаваць адпаведную праграму, каб людзі ў ЛПП маглі набыць нейкія навыкі і сапраўды зарабляць грошы, што дазволіць ім выправіцца і прынясе карысць дзяржаве.

Бераг турэцкі стане бліжэй

Сярод ратыфікаваных шасці міжнародных дакументаў, самым цікавым для абывацеля, стала, напэўна, міжурадавае беларуска-турэцкае пагадненне аб адмене віз.

«Звязда» ўжо пісала, што беларускім грамадзянам пагадненне дасць магчымасць знаходзіцца на тэрыторыі Турцыі на працягу 30 дзён, не афармляючы візы. Пры гэтым маюцца на ўвазе 30 дзён з даты ўезду. На працягу аднаго года можна будзе ўязджаць у Турцыю шматразова без візы, але агульны тэрмін такога знаходжання не павінен перавышаць 90 дзён.

Бязвізавы рэжым не будзе распаўсюджвацца на паездкі з мэтай работы (за выключэннем перавозак пасажыраў і грузаў), вучобы, навуковай дзейнасці, уз'яднання сям'і і пражывання. Грамадзяне Турцыі і Беларусі змогуць ажыццяўляць паездкі без віз, калі яны выязджаюць для правядзення дзелавых перагавораў.

Пры гэтым сама па сабе ратыфікацыя гэтага пагаднення яшчэ не азначае, што пасля яго ўступлення ў сілу адразу ж пачне дзейнічаць бязвізавы рэжым. Неабходна ратыфікаваць і беларуска-турэцкае пагадненне аб рэадмісіі. Палата прадстаўнікоў плануе прыняць законапраект і аб гэтым. Але пакуль што не называюцца канкрэтныя даты.

Намеснік міністра замежных спраў Алена КУПЧЫНА, якая прадстаўляла законапраекты аб ратыфікацыі гэтых пагадненняў, паведаміла, што беларускі бок прапрацоўвае пытанне аб заключэнні пагадненняў па бязвізавых паездках з Гандурасам, Малайзіяй, Панамай, Эквадорам, Перу і Нікарагуа. Больш за тое, ужо вядзецца работа па заключэнні пагадненняў з Рэспублікай Карэя, Бразіліяй і Аргенцінай.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

ПАДАХОДНЫ ПАДАТАК «АТРЫМАЕ» АДЗІНЫЯ ПАДЫХОДЫ

Пашырэнне ільгот па падаходным падатку

Законапраектам прадугледжваецца вызваленне ад абкладання падаходным падаткам даходаў, атрыманых уласнікам і (або) выгадабытчыкам пасля заканчэння дзеяння дагавора давернага кіравання грашовымі сродкамі, у адпаведнасці з якім грашовыя сродкі перадаюцца ў давернае кіраванне на тэрмін не менш за тры гады для інвеставання ў дзяржаўныя каштоўныя паперы, аблігацыі і вэксалі Нацыянальнага банка, якія выпускаюцца (выдаюцца) у мэтах рэгулявання грашовай масы і фарміравання золатавалютных рэзерваў краіны, у аблігацыі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, каштоўныя паперы беларускіх арганізацый.

Таксама прадугледжваецца вызваленне ад падаткаабкладання даходаў плацельшчыкаў, атрыманых ад рэалізацыі доляў удзелу ў статутным фондзе беларускіх арганізацый, якія належаць фізічнай асобе не менш за тры гады, а таксама акцый беларускіх арганізацый, набытых у ходзе іх першага размяшчэння і прададзеных не раней за тры гады з даты набыцця любой трэцяй асобе, якая не з'яўляецца эмітэнтам гэтых акцый. Пры гэтым ільгота будзе прымяняцца ў дачыненні да доляў у статутным фондзе, набытых плацельшчыкам пасля 1 студзеня 2014 года.

Вызваленне ад падаткаабкладання названых даходаў накіравана на доўгатэрміновую перспектыву развіцця рынку каштоўных папер і павінна стварыць дадатковую зацікаўленасць у набыцці каштоўных папер, доляў у статутным фондзе беларускіх прадпрыемстваў. Пры гэтым набыццё каштоўных папер ці доляў будзе ажыццяўляцца не з мэтай наступнага перапродажу (здзяйснення спекулятыўных аперацый), а ў мэтах доўгатэрміновага інвеставання, што, у сваю чаргу, будзе спрыяць мабілізацыі свабодных грашовых сродкаў грамадзян рэспублікі ў рэальны сектар эканомікі.

Вяртанне залішне выплачанага падатку

— Ці будзе ажыццяўляцца вяртанне залішне выплачаных сум падаходнага падатку, вызначаных выходзячы з падатковых дэкларацый, праз падатковых агентаў? Калі так, то ў якія тэрміны падатковы агент будзе рабіць такое вяртанне?

— Заканадаўствам вызначана, што залік або вяртанне залішне выплачанай сумы падатку, збору (пошліны), пені праводзіцца падатковым органам па месцы пастаноўкі на ўлік плацельшчыка (іншай абавязанай асобы).

Таксама вызначана, што залік або вяртанне залішне ўтрыманых падатковымі агентамі сум падаходнага падатку з фізічных асоб у выпадках і парадку, устаноўленых падатковым заканадаўствам, разам з падатковымі органамі маюць права выбраць і падатковыя агенты . А вось вяртанне залішне выплачанага падаходнага падатку, вызначанага выходзячы з падатковай дэкларацыі (разліку), робіцца падатковым органам.

— Залішне ўтрыманыя падатковым агентам сумы падаходнага падатку залічваюцца ў выплату наступных плацяжоў або вяртаюцца плацельшчыку. Заканадаўства гэты алгарытм далей не ўдакладняе. Але хто вызначае, што трэба рабіць: залік або вяртанне? У якія тэрміны вырабляецца вяртанне падатку? Ці можна вырабіць залік і вяртанне, калі вылічанай за бягучы месяц сумы падатку недастаткова для правядзення заліку?

Спадарыня Шаўчэнка ўдакладняе, што залішне ўтрыманыя падатковым агентам сумы падаходнага падатку з фізічных асоб падатковым агентам залічваюцца ў выплату маючых адбыцца плацяжоў падаходнага падатку з фізічных асоб альбо вяртаюцца плацельшчыку.

Пры гэтым пытанне аб тым, ці будзе праведзены залік або вяртанне залішне ўтрыманай падатковым агентам сумы падаходнага падатку з фізічных асоб у кожным канкрэтным выпадку вырашаецца па ўзгодненні бакоў, гэта значыць, паміж плацельшчыкам і найманым.

Вяртанне плацельшчыку залішне ўтрыманых сум падаходнага падатку з фізічных асоб ажыццяўляецца за кошт агульнай сумы падаходнага падатку з фізічных асоб, якая падлягае ўтрыманню з даходаў плацельшчыкаў і выплаце ў бюджэт, або за кошт уласных сродкаў падатковага агента з наступным вяртаннем гэтых расходаў за кошт агульнай сумы падаходнага падатку з фізічных асоб, якая падлягае ўтрыманню з даходаў плацельшчыкаў і выплаце ў бюджэт. Зварот плацельшчыка аб заліку або вяртанні залішне ўтрыманага падаходнага падатку разглядаецца падатковым агентам у тэрміны, вызначаныя заканадаўствам для разгляду зваротаў грамадзян.

Надбаўкі і кампенсацыі

— У асобных арганізацыях прадугледжаны надбаўкі работнікам за раз'язны характар работ у памеры сутачных пры аднадзённых камандзіроўках па тэрыторыі нашай краіны. Згодна з падп. 1.3 арт. 163 ПК ад падаходнага падатку вызваляюцца ўсе віды прадугледжаных заканадаўчымі актамі, пастановамі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь кампенсацый. Пры вызначэнні заканадаўствам нормаў выплаты кампенсацый вызваляюцца ад падаходнага падатку даходы плацельшчыка ў межах такіх нормаў. У якім памеры вызваляюцца ад абкладання падаходным падаткам названыя надбаўкі?

— Артыкулам 99 Працоўнага кодэкса ўстаноўлены кампенсацыі ў выглядзе надбаўкі за рухомы і раз'язны характар працы, вытворчасць работ вахтавым метадам, за пастаянную працу ў дарозе, працу па-за пастаянным месцам жыхарства (палявое забеспячэнне) для работнікаў, занятых у пэўных сферах дзейнасці. Умовы, парадак і памеры выплаты надбавак вызначаны пастановай Савета Міністраў ад 26 мая 2000 года № 763.

Так, згодна з пунктам 7 Палажэння аб умовах, парадку і памерах выплаты надбавак за рухомы і раз'язны характар працы, выкананне працы вахтавым метадам, за пастаянную працу ў дарозе, працу па-за месцам жыхарства (палявое забеспячэнне), зацверджанага пастановай № 763, такая надбаўка да заработнай платы работнікаў вызначаецца ў памеры 40% ад нормы сутачных, устаноўленых нарматыўнымі прававымі актамі аб кампенсацыі выдаткаў пры службовых камандзіроўках, з улікам фактычнага часу знаходжання на тэрыторыі Беларусі, замежных дзяржаў, калі работнік не мае магчымасці штодзённа вяртацца да месца жыхарства; 50% ад нормы сутачных — пры аднадзённых службовых камандзіроўках, калі работнік мае магчымасць штодзённа вяртацца да месца жыхарства.

Акрамя таго, пунктам 2 пастановы № 763 арганізацыям дадзена права вызначаць пры неабходнасці работнікам штодзённыя надбаўкі да заработнай платы за кошт прыбытку, які застаецца ў распараджэнні арганізацый: да памеру нормы сутачных — пры выкананні працы вахтавым метадам, за пастаянную працу ў дарозе, працу па-за месцам жыхарства; да памеру нормы сутачных — пры аднадзённых камандзіроўках, калі праца носіць раз'язны характар або працякае ў дарозе і калі работнік можа штодзённа вяртацца да свайго месца жыхарства.

У адпаведнасці з падпунктам 1.3 пункта 1 артыкула 163 ПК ад падаходнага падатку вызваляюцца ўсе віды кампенсацый, прадугледжаных заканадаўчымі актамі, пастановамі ўрада (за выключэннем кампенсацыі за няпоўнае выкарыстанне працоўнымі водпуск, кампенсацыі за знос транспартных сродкаў, абсталявання, інструментаў і прыстасаванняў, якія належаць работніку). Пры вызначэнні заканадаўствам нормаў выплаты кампенсацый вызваляюцца ад падаходнага падатку даходы плацельшчыка ў межах такіх нормаў.

Улічваючы, што заканадаўствам не вызначаны нормы выплаты такіх кампенсацый (40 % і 50 % ад нормы сутачных — гэта заканадаўча ўстаноўлены памер абавязковай выплаты кампенсацыі, а не яе норма), то кампенсацыя ў выглядзе надбаўкі да памеру нормы сутачных (згодна з пунктам 2 пастановы № 763) вызваляецца ад падаходнага падатку.

Грашовыя пазыкі ад фізічных асоб

— Арганізацыя атрымала доўгатэрміновую пазыку ў замежнай валюце ад фізічнай асобы-нерэзідэнта. Па ўмовах дагавора працэнты за карыстанне пазыкай выплачваюцца адначасова з вяртаннем пазыкі. Арганізацыя штомесяц адлюстроўвае налічэнне працэнтаў у бухгалтарскім уліку і вылічвае падаходны падатак з налічанага нерэзідэнту даходу, выходзячы з афіцыйнага курсу замежнай валюты на апошнюю дату месяца. Ці неабходна арганізацыі пры пералічэнні працэнтаў пералічыць суму атрыманага даходу, выходзячы з афіцыйнага курсу замежнай валюты на дату яго выплаты і, адпаведна, пералічыць суму вылічанага падаходнага падатку?

— У такой сітуацыі прыбыткам фізічнай асобы-нерэзідэнта з'яўляюцца працэнты, атрыманыя ім у замежнай валюце па дагаворы пазыкі. У адпаведнасці з нормамі артыкула 175 Падатковага кодэкса падаходны падатак падлягае ўтрыманню і пераліку падатковым агентам пры фактычнай выплаце названага даходу. На падставе пункта 6 артыкула 156 ПК даходы плацельшчыка, атрыманыя ім у замежнай валюце, пералічваюцца ў беларускія рублі па афіцыйным курсе, вызначаным Нацыянальным банкам Беларусі на дату фактычнага атрымання даходу.

Адпаведна, і сума працэнтаў па дагаворы пазыкі, якая падлягае падаткаабкладанню падаходным падаткам даходу фізічнай асобы-нерэзідэнта, атрыманая ў замежнай валюце, падлягае пераліку.

Сяргей КУРКАЧ.

■ Нерухомасць

«БЕЛГІПСУ» ПАТРЭБНЫ ПЕРСПЕКТЫЎНЫ ІНВЕСТАР

Дзяржаўны камітэт па маёмасці Беларусі аб'яўляе конкурс па адборы інвестара для ўдзелу ў прыватызацыі дзяржаўных акцый (99,5% статутнага фонду) адкрытага акцыянернага таварыства «Белгіпс», паведамілі рэдакцыі ў прэс-службе камітэта.

Пасля набыцця гэтага пакета каштоўных папер інвестар павінен выканаць пэўныя ўмовы конкурсу. Такім чынам, на працягу 5 гадоў з дня заключэння дагавора куплі-продажу акцый таварыства новы ўладнік павінен павялічыць статутны фонд прадпрыемства за кошт уласных інвестыцый на суму, эквівалентную не менш за 43 млн еўра, у тым ліку да 1 ліпеня 2016 года ў суме, эквівалентнай не менш за 24,7 млн еўра. Такія інвестыцыі будуць накіраваны на мадэрнізацыю на працягу двух гадоў дзеючай лініі па вытворчасці гіпсакардонных лістоў на айчынным прадпрыемстве з павелічэннем яе магутнасці да 10 млн кв. метраў у год. Умовы конкурсу прадугледжваюць будаўніцтва завода па вытворчасці будаўнічых матэрыялаў на аснове гіпсу ў раёне пасёлка Гатава Мінскага раёна (лініі па вытворчасці спецпліт магутнасцю да 500 тысяч кв. метраў у год, сухіх будаўнічых сумесяў магутнасцю да 100 тысяч тон у год, гіпсакардонных лістоў магутнасцю да 30 млн кв. метраў у год. Да пачатку 2019 года інвестар павінен захаваць на прадпрыемстве існую чую цяпер колькасць працоўных месцаў.

Прыём заяў ад патэнцыяльных інвестараў ажыццяўляецца сёлета да 1 лістапада. Продаж дзяржаўных акцый акцыянерных таварыстваў краіны ажыццяўляецца па рашэнні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Сяргей КУРКАЧ

■

ПРОДАЕТСЯ СКЛАД
1 060 м²
г. Гродно,
ул. Станция Лососно, 28.
Тел. 8029 195-56-81.
УНП 100080849

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

УЗНАГАРОДЖАНЫ ЛЕПШЫЯ МАЙСТРЫ КАРОТКАГА АПАВЯДАННЯ

Урачыстая цырымонія ўзнагароджання пераможцаў першага Міжнароднага літаратурнага конкурсу маладых літаратараў Саюзнай дзяржавы «Мост дружбы»-2012 адбылася ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Фота БЕЛТА.

Па выніках творчых спаборніцтваў экспертны савет выбраў 10 пераможцаў. На ўрачыстасці прысутнічалі 7 лаўрэатаў. Спецыяльных дыпломаў былі ўдастоены Аляксандр Масквін, Георгій Фамін (Расія), Мікалай Андрэеў, Маргарыта Латышкевіч, Вольга Чаркас, Дар'я Вашкевіч, Алёна Беланожка (Беларусь). Таксама ў Мінску прадставілі альманах «Мост дружбы» — першы зборнік апавяданняў лаўрэатаў конкурсу Саюзнай дзяржавы для маладых пісьменнікаў.

Звяртаючыся да ўдзельнікаў з прывітальным словам, дзяржсакратар Саюзнай дзяржавы Рыгор Рапота адзначыў, што раз у два гады зацвярджаюцца прэміі Саюзнай дзяржавы ў галіне літаратуры і мастацтва. «Моладзь непакоілася, калі ж загавораць пра нас! Задума была ў тым, каб стварыць літаратурны альманах з творамі лепшых майстроў кароткага апавядання. На працягу двух гадоў выдаваўся такі альманах і лепшыя майстры кароткага апавядання станавіліся яго ўдзельнікамі», — сказаў Рыгор Рапота.

У сваю чаргу намеснік міністра інфармацыі Беларусі Уладзімір Матусевіч адзначыў, што правядзенне конкурсу служыць імпульсам для творчага развіцця. «Маладым літаратарам заўтра вызначаць аблічча культурнай і інфармацыйнай прасторы Беларусі, Расіі, Саюзнай дзяржавы. Добра, што ёсць такая магчымасць сустрэч, а таксама публікацыі ў такім аўтарытэтным выданні, як літаратурны альманах».

КІРМАШ ВАКАНСІЙ: ПРАЦА НА ЛЮБЫ ГУСТ

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Мерапрыемства прайшло ў Мінску. Больш за сто сталічных наймальнікаў прапанавалі каля 7 тысяч вакансій у сферах прамысловасці, будаўніцтва, аховы здароўя, бытавога і гасцінічнага абслугоўвання, жыллёва-камунальнай гаспадаркі. На кірмашы была магчымасць працаўладкавацца студэнтам, пенсіянерам і, дарэчы, не толькі мінчанам, але і іншагароднім грамадзянам. Па стане на 1 кастрычніка, у гарадской службе занятасці стаяць на ўліку каля 1,5 тыс. беспрацоўных, заяўленая арганізацыямі патрэба ў работніках склала 24 тыс.

Марына БЕГУНКОВА.

У ПРАГРАМІСТАЎ БДУ НАЙБОЛЬШ ШАНЦАЎ НА ПОСПЕХ

Чатыры каманды факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ выйшлі ў паўфінал чэмпіянату свету па праграванні. Пры гэтым адна з камандаў, за якую выступалі чацвёртакурснікі Яўген Грыцкевіч, Аляксей Колесаў і трэцякурснік Аляксандр Некрашэвіч, стала абсалютным пераможцам чвэрцьфінальнага этапу.

У адборачным туры чвэрцьфінальнага паядынку Заходняга рэгіёна ўзялі ўдзел 55 камандаў з ВНУ Беларусі, Літвы, Латвіі, Эстоніі і Калінінградскай вобласці. Каманды беларускіх ВНУ размясціліся на наступных пазіцыях: у студэнтаў БДУ — 1, 2, 6, 8, 9 і 13 месцы, у каманды Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я.Купалы — 4 месца, у праграмістаў БДУІР — 12,15,16 і 19-месца. 14 месца — у студэнтаў Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны, 17-е — у прадстаўнікоў Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта, а 20 радок рэйтынгу заняла каманда з Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта.

У адпаведнасці з правіламі чэмпіянату свету па праграванні, у паўфінал выйшлі чатыры каманды БДУ. Дзве свае каманды змогуць выставіць у паўфінале Латвійскі ўніверсітэт, Каўнаскі тэхналагічны ўніверсітэт, Балтыйскі федэральны ўніверсітэт імя Канта і БДУІР. І адной камандай праграмістаў будуць прадстаўлены Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны, Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт, Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт і Вільнюскі ўніверсітэт.

Надзея НІКАЛАЕВА.

НОВЫ СТАДЫЁН У АШМЯНАХ

Сучаснае пакрыццё для футбольнага поля бясплатна прадаставіла Беларуская федэрацыя футбола. Ашмянцы, у сваю чаргу, паклапаціліся аб падрыхтоўцы пад гэтае пакрыццё пляцоўкі, добраўпарадкаванні тэрыторыі.

З нагоды ўрачыстага адкрыцця новага стадыёна адбыліся першыя матчы паміж камандамі Ашмян і Іўя, а таксама ветэранаў футбола Гродзеншчыны і БФФ. Акрамя таго, старшыня Ашмянскага райвыканкама Міраслаў Сарасек уручыў аддзелу адукацыі, спорту і турызму сертыфікат на 40 мячоў. Дарэчы, год таму пры падтрымцы Беларускай федэрацыі футбола і мясцовых улад у горадзе створана прыватная дзіцячая футбольная школа «Нёман» (Ашмяны) пад кіраўніцтвам Аляксандра Кушнера.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

ПЕРАКУЛІЎСЯ ВЕЖАВЫ КРАН

Гэтае здарэнне адбылося ў Салігорскім раёне на прамляцоўцы. Пацярпелі людзі...

Як паведамілі ў Мінскім абласным упраўленні МНС, на тэрыторыі ўнітарнага вытворчага прадпрыемства «Ніва» пры дапамозе аўтамабільнага крана праводзіўся дэмантаж вежавага. Апошні і перакуліўся. Пры яго падзенні пацярпелі тры чалавекі, адзін з якіх у цяжкім стане быў дастаўлены ў рэанімацыйнае аддзяленне Салігорскай цэнтральнай раённай бальніцы. Яшчэ дваіх пацярпелых у здавальняючым стане паклалі ў траўматалагічнае аддзяленне. Кран таксама пашкодзіў дах і сцяну будынка вытворчага цэха, што належыць прадпрыемству «Ніва», два гаражы на тэрыторыі ДТСААФ і аўтамабіль «ВАЗ», які знаходзіўся ў адным з іх.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ДЗІЧЫНА ПАДВЯЛА ПАД КРЫМІНАЛ

Падчас рэйду каля 4 гадзін раніцы супрацоўнікі Глыбоцкай міжрайінспекцыі разам з супрацоўнікамі Дэпартамента аховы спынілі аўтамабіль «Форд-Фіеста», якім кіраваў жыхар Докшыцкага раёна. Пры даглядзе малалітражкі былі знойдзены незарэгістраваная паляўнічая стрэльба і пяць мяхоў з мясам. Як паведаміў начальнік міжрайінспекцыі Аляксей Протас, падчас разбіральніцтва ўдалося высветліць, што «ахвярай» браканьера стаў лось. Незаконнае паляванне вялося на тэрыторыі Браслаўскага раёна. Парушальніку пагражае крымінальная адказнасць.

Ул. інф.

■ Нефармат

ЦЫРК НА ДРОЦЕ

У Баранавічах дзеці пайшлі ў цырк выхадным днём, а дадому пасля спектакля не вярнуліся, бо апынуліся ў траўматалагічным аддзяленні бальніцы. Цырк-шапіто прыехаў у горад на гастролі, і многія гараджане набылі білеты для сваіх дзяцей. Вось і 12-гадовых дзяўчынак-двайнятак мама прывяла на нядзельную праграму.

І ўсё ішло добра, прынамсі, у першым аддзяленні. А ў антракце работнікі цырка аб'явілі экстрэмальны атракцыён. Кожны ахвотны мог за 30 тысяч рублёў узляцець пад купал цырка на арэлях. Вядома, многія дзеці захацелі. Дзяўчынак пасадзілі разам з 7-гадовым хлопчыкам, дзяцей прышпілілі рамянямі бяспекі. Арэлі прывёў у дзеянне механізм, і яны пачалі гойдацца і набіраць вышыню. І на адлегласці недзе 3-4 метраў ад падлогі нечакана парваўся трос. Дзеці ўпалі разам з арэлямі на арэну. У выніку хлопчык атрымаў лёгкую траўму, яму аказалі медыцынскую дапамогу і адпусцілі дамоў, а дзяўчынак даставілі ў бальніцу. У адной з сясцёр, акрамя страсення мозга і ўдару грудной клеткі, выяўлены пералом двух пазванкоў. Жыццю гэта не пагражае, але ў бальніцы пацыентка правядзе не менш за месяц. Акрамя таго, ніхто не ведае, як у будучыні гэтая траўма адаб'ецца на здароўі. Маці дзяўчынак звярнулася ў міліцыю з заявай аб прыцягненні вінаватых да адказнасці.

Жанчыну больш за ўсё абурыў той факт, што пасля інцыдэнту ніхто не папрасіў прабачэння. Пацярпелых вывелі за кулісы і прадоўжылі цыркавое прадстаўленне, нібы нічога не здарылася. А бацькам пацярпелых дзяцей сказалі, што гэта ж... цырк, а ў цырку ўсё бывае, ніхто не ведае, калі які дрот парвецца.

Сапраўды, можа быць усё, калі на першы план ставіцца жаданне зарабіць як найбольш грошай. Перасоўнае абсталяванне, як вядома, кожны раз манціруецца наноў, і тут трэба ўлічваць славуты «чалавечы» фактар. Недзе нейкі рабочы не дакруціў гайку ці болт на міліметр — вось і рэальная магчымасць няшчаснага выпадку. Таму кіраўніцтва цырка ці іншага перасоўнага забаўляльнага аб'екта павінна браць на сябе адказнасць за бяспеку, адчуваць таксама маральную адказнасць. А калі не ўпэўнены, то лепей і не трэба рызыкаваць, прапануючы новую паслугу. Не дай Бог, трос парваўся б, калі дзеці былі на вышыні не тры альбо чатыры метры, а дзесяць... Не хочацца нават працягваць. Бяда і так прыйшла ў сям'ю. Дзяўчаткі марылі пра канікулы, збіраліся паехаць на экскурсію, а цяпер будуць толькі лячыцца. Ды і за здароўе адной з дачок бацькі сур'ёзна асцерагаюцца.

...Гадоў з сем таму ў Брэсце гастролі аднаго з расійскіх цыркаў скончыліся наогул трагедыяй. Пляцоўку яны арандавалі побач з Домам друку. Справа была летам, днямі грымела музыка, людзі стаялі ў чарзе. Атракцыёнаў было шмат, некаторыя з іх мелі абмежаванні па ўзросце, бо разганяліся на вялікія хуткасці. І вось на адным з сеансаў цялежка-каталка на павароце саскочыла з рэек, перавярнулася, з яе выпала зусім маладая жанчына і загінула на месцы. Няшчасная толькі-толькі нарадзіла дзіця, і родныя, можа, першы раз адпусцілі яе пагуляць па горадзе. Вось яна і знайшла на сваё гора забаву. Тады гэтая трагедыя мела вялікі грамадскі рэзананс у горадзе. Наведнікі інтэрнэт-форумаў патрабавалі ад гарадскіх уладаў наогул не пускаць у горад забаўляльнікаў-гастралёраў. Але прайшоў час, і розныя цыркі-атракцыёны зноў працуюць на гарадскіх пляцоўках, перад гэтым збіраючы і манціруючы абсталяванне. Таму і самім аматарам экстрыму, і асабліва бацькам, трэба сем раз узважыць, ці варта купляць білеты на заезджы атракцыён, альбо, як у названым выпадку, дазваляць дзецям гушкацца...

Як паведамілі ў Баранавіцкім міжраённым аддзеле Следчага камітэта РБ, па факце няшчаснага выпадку вядзецца праверка, і перш за ўсё высветляецца законнасць правядзення атракцыёна ў перапынку. Па выніках праверкі будзе прынята рашэнне, не выключаецца і распачынанне крымінальнай справы.

Але кожны такі выпадак яшчэ раз нагадвае, як многа заключае ў сабе банальная, на першы погляд, фраза: «Беражыце сябе!». Мінута задавальнення не вартая таго, каб выпрабоўваць лёс.

Святлана ЯСКЕВІЧ

■

У Адэсе выберуць самую прыгожую жонку ў Еўропе

Цягам тыдня, з 17 па 22 лістапада, два дзясяткі прыгожых, разумных, а галоўнае — замужніх жанчын з розных краін Еўропы будуць спаборнічаць за тытул «Місіс Еўропа 2013». Беларусь на гэтым міжнародным форуме прадставіць Наталля Трафімава — практыкуючы адвакат і маці 12-гадовага сына.

Конкурс «Місіс Еўропа» нарадзіўся ў Балгарыі, праводзіцца ў розных краінах ужо больш за 10 гадоў. Мае на мэце, акрамя ўласна абрання каралевы прыгажосці, прыцягненне ўвагі СМІ і грамадскасці да сур'ёзных праблем сучаснасці. Так, сёлета, як і летась, удзельніцы форуму зладзяць канферэнцыю сацыяльных дакладаў, каб шырэй абмеркаваць праблему хатняга гвалту.

Паводле правілаў, паўдзельнічаць у конкурсе могуць жанчыны ва ўзросце ад 19 да 40 гадоў, якія маюць устойлівую жыццёвую пазіцыю, дасягнулі поспеху ў прафесіі, знаходзяцца ў шлюбе або маюць дзяцей. Акрамя звыклых для конкурсаў прыгажосці дэфіле, «Місіс Еўропа» прадугледжвае насычаную дабрачынную праграму. Знарок для яе беларуская ўдзельніца, напрыклад, рыхтуе падарункі дзецям з сацыяльных прытулкаў, а таксама сувеніры для іншых канкурсантак. Усяго ж удзел у конкурсе сёлета бяруць больш як 20 прыгажунь з розных еўрапейскіх краін, у тым ліку Расіі, Украіны, Італіі, Грэцыі, Бельгіі, Чарнагорыі, Грузіі.

У фінальным шоу, якое адбудзецца 21 лістапада ў канцэртнай зале «Сады Перамогі» ў Адэсе, журы вызначыць лепшую з лепшых па выніках чатырох выхадаў — у адноль-кавых сукенках, у нацыянальных строях, у купальніках і вячэрніх уборах. Зрэшты, як падкрэсліваюць мясцовыя СМІ, суддзі будуць ацэньваць не толькі і не столькі знешнасць, колькі сукупнасць усіх якасцяў прэтэндэнтак на карону — іх таленты, дасціпнасць і розум, актыўную жыццёвую пазіцыю і спагадлівасць.

Між іншым, летась конкурс «Місіс Еўропа» праходзіў у Беларусі. Тады яго галоўны прыз — карону коштам у 3000 еўра — атрымала Алена Мазалёва з Украіны. Дзякуючы гэтаму сёлета форум і атрымаў украінскую «прапіску».

Што да прадстаўніцы Беларусі, то Наталля Трафімава не першы раз бярэ ўдзел у падобных мерапрыемствах. У яе актыве тытул «Місіс Сяброўства» на леташнім конкурсе «Місіс Сусвет» і ўдзел у конкурсе «Лэдзі Бос 2012». Таксама яна выступала суарганізатарам конкурсу «Місіс Еўропа-2012». «Кожная жанчына едзе на конкурс не сама па сабе, а ў пэўным сэнсе як пасол добрай волі, і яе місія — годна прадставіць сваю краіну», — пераканана беларуская канкурсантка.

8.10, 8.35, 9.10, 9.35 Раніца з ІНТЭРам.
10.10 Рэчавы доказ.
10.50, 17.10, 1.45 Судовыя справы.
11.30, 17.50, 2.30 Сямейны суд.
12.15, 19.30 Серыял «Маршрут міласэрнасці».
13.20 Серыял «Аднойчы будзе каханне».
14.05, 20.15, 5.00 Серыял «Міліцэйская акадэмія».
14.30 Формула кахання.
15.15, 6.15 Серыял «Жыццё як жыццё».
16.00 Дак. серыял «Жыццё сярод жыцця».
16.25 Арол і рэшка.
18.40, 5.25 Серыял «Тайны знак-1».
20.15, 3.15 Ток-шоу «Датычыцца кожнага».
21.00, 4.00 Падрабязнасці.
21.30 Ток-шоу «Шустэр Live».
3.15 Дак. серыял «Містычная Украіна».
4.30 Смартшоу.

НАСТАЛЬГІЯ

5.00 «Наша біяграфія». Дак. фільм.
6.00 «Музыка ў тэатры, у кіно, на ТБ». 1984 год.
6.40, 12.40, 18.35 «Гэта было ў Какандзе». Маст. фільм.
7.45 «Добрай ночы, малыя». 1983 год.
8.00, 14.00, 20.00, 2.00 «Час».
9.00, 15.00, 3.00 «Народжаныя ў СССР».
10.00, 16.00 «Шырэй круг». 1987 год.
11.00, 17.00 «Вакол смеху». 1980 год.
12.00 «Мы — маладая гвардыя. Свята юнацтва». Дак. фільм.
13.45 «Хто ты, Джордж Бондджавані?». Дак. фільм.
18.00 «Мы жадаем шчасця вам». Дак. фільм.
19.40 «Лёд і фантазія». Дак. фільм.
21.00 «Колба часу».
22.00 «Кінапанарама». Фрагменты выпускаў 1981/88 гг.
23.00 «Эліта краіны Саветаў». Руслан Хасбулатаў.
0.00 «Ранішняя пошта». 1988 год.
0.40 «Кавалёва з правінцыі». Фільм-спектакль. 2-я частка. 1975 год.
1.30 «Мастак і паэт Міхаіл Гробман чытае свае вершы». 2005 год.
4.00 «Сустрэча з Анатолем Папанавым». Фільм-канцэрт. 1975 год.

EUROSPORT

9.30 Кірунак — спорт.
9.35 Снукер. International Championship.
16.30 Еўраспорт. Топ 10.
17.00, 1.00 Футбол. Чэмпіянат свету (U 17). ААЭ.
20.00, 0.00 Боўлінг. РВА.
21.00 Самыя дужыя людзі планеты.
22.00 Бокс.
2.00 GTA. Наступны ўзровень.
2.15 Вось гэта дзіва!!!

КАМЕДЫЯ

5.00, 10.55, 17.00, 19.00, 2.05 Скетчком «Паміж намі».
5.15, 8.00, 12.55, 16.00, 21.00, 2.20 Серыял «Камп'ютаршчыкі».
6.15 Камедыя «Оскар».
7.40, 8.25, 13.50, 15.40, 21.50, 3.10 «Камедыянты. Лепшае».

ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ
25 кастрычніка 2013 г.

8.40 Мюзікл «Трое ў лодцы, не лічачы сабакі».
11.15 Камедыя «Экстрэмальнае спатканне».
14.10 Камедыя «Мой лепшы сябар».
17.20 Камедыя «Гэтае няпэўнае пачуццё».
19.20 Камедыя «Зачараваная Эла».
22.10 Камедыя «Сутэнёр».
23.40 Камедыя «Граф».
0.10 Камедыя «Паўтара рыцара».
3.25 Камедыя «Бамбу».

ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

2.00, 8.00, 14.00 Камедыя «Вусаты нянь».
3.10, 9.10, 15.10 М/с «Маўглі». Зборнік м/ф. «Жылі-былі думкі». «Птушкалоў».
4.00, 10.00, 16.00 М/с «Воін Сандакан. Кароль тыграў». Казкі Андэрсена. «Свіння-скарбонка». Зборнік м/ф. «Прагны Кузя». «Сонечны каравай».
5.00, 11.00, 17.00 Фільм-казка «Прададзены смех». 2-я серыя. Зборнік м/ф. «Чатыры неразлучныя тараканы і цвыркун». «Кансервавая бляшанка».
6.30, 12.30, 18.30 М/с «Нябесныя танцоры».
7.00, 13.00, 19.00 «Урокі цётачкі Савы». Зборнік м/ф. «Восеньская рыбалка». «Дожджык, дожджык, мацней». «Пра вялікіх і маленькіх».

ТБ3

6.00 М/ф.
8.30, 18.30, 2.40 Серыял «Цудоўнае стагоддзе».
10.45, 17.00 Дак. серыял «Паралельны свет».
11.45, 16.00 Дак. серыял «Варажбітка».
12.45, 18.00 Дак. серыял «Паляўнічыя на прывідаў».
13.15 Серыял «Ялта 45». Заключныя серыі.
15.10, 1.55 Серыял «Менталіст».
20.30 Камедыя «Гэта вельмі забаўная гісторыя».
22.30, 4.20 Маст. фільм «Праз 28 тыдняў».
0.20 Серыял «Падмані мяне».

ТБ1000

5.00, 11.00 Фэнтэзі «Буйная рыба».
7.10 Камедыя «Каханне, якое збівае з ног».
9.00, 20.35 Драма «Радыё».
13.20 Драма «Перад захадам».
14.50 Драма «Павуцінне хлусні».
17.10 Камедыя «Кабельшчык».
19.00 Камедыя «Юнацтва, якое бунтуе».
22.30 Камедыя «Мноства».
0.35 Драма «Усмешка Моны Лізы».
2.40 Драма «Марыя-Антуанета».

ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.00 Камедыя «Аднойчы праз дваццаць гадоў».
8.00 Драма «Жыві і памятай».
10.00 Меладрама «Хутка вясна».
12.00 Драма «Дзесяць гадоў без права перапіскі».
13.50 Драма «Высоцкі. Дзякуй, што жывы».
16.10 Камедыя «Перцы».
18.00 Меладрама «Снягір».
20.00 Меладрама «Выкрутасы».
22.00 Камедыя «Бабло».
23.40 Меладрама «Залатыя нябёсы».

NATIONAL GEOGRAPHIC

5.00, 16.00, 21.00, 1.00, 4.00 Каралі рыбалкі.
6.00, 19.00 Дзікі тунец.
7.00 Знаёмцеся — дыназаўры.
8.00, 13.00 Віні Джонс: Рэальна пра Расію.
9.00, 14.00 Браты па зброі.
10.00 Гульні розуму.
11.00, 23.00 Турэмныя цяжкасці.
12.00, 18.00 Зброевыя бароны.
15.00 Драпежнікі неба.
17.00, 2.00 Сакрэтная зброя Гітлера.
20.00, 0.00, 3.00 Экстрэмальнае падарожжа.
22.00 Зламіць сома.

DISCOVERY

7.00, 16.25 Залатая ліхаманка.
7.50, 12.20, 3.05 Мужчына, жанчына, прырода.
8.40, 20.35 Як гэта ўстроена.
9.10, 20.05, 4.45 Як гэта зроблена?
9.35 Паляўнічыя на склады.
10.30, 0.00 Самыя дзіўныя.
11.25, 3.55 Разбуральнікі легенд.
13.15, 0.55 Top Gear.
14.10, 6.05 Вялікі махінатар.
15.05 Пятая перадача.
15.30, 5.10 Хлопцы з гарматамі.
17.20 Паляўнічыя на рэліквіі.
18.15 Махінатары.
19.10 Хуткія і гучныя.
21.00 Пераломныя бітвы.
22.00 Свет кантрабанды.
23.00 Мафія амішаў.
1.50 Імперыя па-за законам.
2.40 Маланкавыя катастрофы.
1.20 Дэтэктыў «Закон зайца».
3.20 Камедыя «Лятучая мыш».

NATIONAL GEOGRAPHIC

5.00, 10.00, 16.00 Кракадзілы Катумы.
6.00, 8.00 Дзікі тунец.
7.00 Рабі стаўкі і ўзрывай.
9.00 Каралі рыбалкі.
10.00, 13.00, 18.00 Гульні розуму.
11.00 Дзіўнае побач.
12.00 Міжнародны аэрапорт Дубай.
14.00 Мегапераезды жывёл.
15.00 Астравы.
16.00 Золата горада-прывіда.
17.00 Падарожжа на караблі Сіндбада-марахода.
19.00 Шукальнікі скарбаў.
20.00, 0.00, 3.00 Сакрэтныя матэрыялы старажытнасці.
21.00, 1.00, 4.00 Забароны.
23.00, 2.00 Расследаванні авіякатастроф.

СУБОТА, 2 ЛІСТАПАДА

БЕЛАРУСЬ 1

6.45 Меладрама «Восеньскі марафон».
8.20 Існасць.
8.50 Слова Мітрапаліта Філарэта на Дзімітрыеўскую Бацькоўскую суботу.
9.00, 12.00, 15.00, 19.00 Навіны.
9.10 Зямельнае пытанне.
9.35, 1.00 Камедыя «Ластаўчына гняздо».
12.10 Здароўе.
13.00 Усё як трэба!
13.35 Нашы.
13.45 Тайны следства.
14.15 Вакол планеты.
15.15 Навіны рэгіёна.
15.30 «Зорнае жыццё». «Невядомыя дзеці вядомых бацькоў».
16.35 Давярай і правярай.
17.00 Камедыя «Казкі на ноч».
18.35 Навіны. Цэнтральны рэгіён.
19.10 Камедыя «Вяселле па абмене».
21.00 Панарама.
21.40 Урачыстае адкрыццё XX Мінскага міжнароднага кінафестывалю «Лістапад-2013».
22.40 Баявік «Пятля часу».
0.50 Дзень спорту.

БЕЛАРУСЬ 2

7.45 М/ф «Велікан-эгаіст».
7.55 Серыял «Госця з будучыні». 1-я і 2-я серыі.
10.05, 20.55 Тэлебарометр.
10.10 Месцы сілы.
10.40 Камедыя «Утаймавальніца тыграў».
12.35, 22.55 «СуперІнтуіцыя. Бітва полаў».
13.45 «Бітва экстрасэнсаў».
15.00, 0.20 Серыял «Таксі».
16.15 Камедыя «Фальшывае вяселле».
18.05 Імперыя песні.
19.15 Ваша лато.
19.55 Латарэя «Пяцёрачка».
20.15 Цудоўная сямёрка. Вяртанне.
21.00 КЕНО.
21.05 Камедыя «Віктар».
23.55 «Жаночая ліга. Бананавы рай».

БЕЛАРУСЬ 3

8.00, 11.35, 17.00, 19.25, 23.35 «Калейдаскоп».
8.05 «Прыстанак душы».
8.35 «Кожны мае права быць розным». Цуд кахання.
9.05 Дзіцячы фільм. «Неадкрытыя астравы».
10.10 «Без эпітафіі». Пра трагічны лёс Зміцера Жылуновіча (Цішкі Гартнага).
10.50 «Шчасце». Дак. фільм.
11.10 «Наперад у мінулае».
11.45 «Калі нараджаўся новы свет... Максім Лужанін».
12.25 «Карані».
12.50 «Радавод». Стравы на дзяды.
13.05 «Сустрэча на Эльбе». Дак. фільм.
13.35 «Одной звезды я повторяю имя...». Дак. фільм пра Пятра Клімука.
14.05 «Камертон». Дзмітрый Хварастоўскі.
14.30 «Маналог. Леанід Левін». Дак. фільм.
15.05 «Глыбокае». Дак. фільм.
15.20 Канцэрт групы «The Straits».
17.05 «Уся каралеўская раць». 1-я — 3-я серыі. Маст. фільм.
20.30 Калыханка.
20.50 Сусветнае кіно. «Сямейны партрэт у інтэр'еры».
22.50 «Без права на дубль». Уладзімір Мігуля.

АНТ

7.00 «Суботняя раніца».
8.00, 9.00 Нашы навіны.
9.05 М/с «Смяшарыкі». Новыя прыгоды.
9.20 «Здароўе».
10.25 «Смак».
11.05 «Ідэальны рамонт».
12.05 «Разумніцы і разумнікі».
12.55 «Міхаіл Таніч. Апошняе мора».
13.55 Серыял «Вяпрук».
16.00, 20.30 Нашы навіны.
16.15, 21.00 Навіны спорту.
16.20 «Адгадай мелодыю».
17.00 «Абмен жонкамі».
18.10 «Адзін супраць усіх».
19.05 «Хвіліна славы. Дарога на Алімп!».
21.05 «Сёння ўвечары».
22.55 «Паспець да паўночы».
23.35 «Што? Дзе? Калі?».
0.50 Баявік «Красунчык Джоні».

СТБ

6.00 Серыял «Next 2».
6.50 «Анфас».
7.05 Камедыя «Адпетыя махляры».
9.00, 13.40, 20.10 «Гарады, якія спяваюць». Дзённік.
9.10 «Чыстая праца».
10.00 «Іншая краіна». «Японія: па той бок сушы».
11.00 «Уявіце сабе».
11.30 «Мінск і мінчане».
12.05 «Прыгоды дылетанта».
12.40 «Сакрэтныя тэрыторыі».
13.50 Маст. фільм «Чалавек з бульвара Капуцынаў».
15.40 «Ваенная тайна».
16.30, 19.30 «24 гадзіны».
16.45 «Наша справа».
17.00 «Вялікі горад».
17.40 «Эліксір маладосці».
18.35 «Дзіўная справа».
20.00 «СТБ-спорт».
20.20 Маст. фільм «Прышэльцы».
22.25 «Зорны рынг». Новы сезон. Бітва кавер-бэндаў».
23.40 Маст. фільм «Ліван».
1.20 «Глядзець усім!»

МІР

5.00 Маст. фільм «Тарцюф».
7.10 М/ф.
9.00, 15.00 Навіны Садружнасці (бягучы радок).
9.10 Маст. фільм «Цырк».
10.50, 0.30 Серыял «Імперыя пад ударам».
15.10 Серыял «Жураў».
20.40 Серыял «Турэцкі гамбіт».
4.20 «Зроблена ў СССР».

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 Маст. фільм «Моцная слабая жанчына».
8.40 Маст. фільм «Гарачы лістапад».
10.25 «Ранішняя@пошта».
11.00, 14.00, 20.00 Весткі.
11.15 «Суботнік».
11.55 М/ф.
12.10 Маст. фільм «Мядовы месяц».
14.15 «Уся Расія».
14.30 «Сумленны дэтэктыў».
15.05 «Гарадок».Дайджэст.
15.45 Камедыя «Раз, два! Кахаю цябе!».
19.00 «Карціна свету».
19.55 Надвор'е на тыдзень.
20.45 «Танцы з Зоркамі». Сезон-2013.
23.30 Маст. фільм «Нявеста майго жаніха».

НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.25 Серыял «Дарожны патруль».
8.00, 10.00, 13.00, 19.00 Сёння.
8.20 «Агляд».
8.50 «Гатуем з Аляксеем Зіміным».
9.25 «Справа густу».
10.20 «Галоўная дарога».
10.50 «Кулінарны паядынак».
11.55 «Кватэрнае пытанне».
13.20 «Я худзею».
14.20 Ток-шоу «ДНК».
15.10 Серыял «Важняк».
16.45, 19.20 Серыял «Шэф».
23.25 Серыял «Уцякач».

8 КАНАЛ

9.00, 13.25, 18.55, 21.00, 23.45 «Надвор'е».
9.05 «Мультпарад».
9.15 «На рыбалку».
9.30 Серыял «Фірма».
11.00 «Даведнік па краінах і кантынентах».
11.10 Трылер «Фарсаж».
13.30 Прыгоды «Дом кінжалаў, якія лятаюць».
15.35, 23.30 «Кінаблакнот».
16.00 «Адшукваецца адпавышнак».
16.35 Фільм-дзецям. Серыял «Прыгоды Шырлі Холмс».
17.00 «VR дайджэст».
17.20 Серыял «Пад купаламі».
19.00 Драма «Смерць у эфіры».
20.45 «Вечарніца».
21.05 Трылер «Зорны шлях».

ВТБ

6.00, 1.00 «PLAY».
8.00 М/ф «Смяшарыкі».
8.30 Серыял «Татавы дочкі».
9.30 «Спатканне са смакам».
10.00, 17.00 Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
10.30 «Вясёлыя гісторыі з жыцця».
11.00, 23.00 Серыял «Аднакласнікі».
11.30 «Мужчынская праца».
12.00, 22.30 Скетч-шоу «6 кадраў».
12.30, 0.30 Скетч-шоу «Анекдоты».
13.00, 0.00 «Улётнае відэа».
13.30, 22.00 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
14.00 Серыял «Амазонкі».
16.00 «Шлюб без аховяр».
17.30 «Нерэальная гісторыя».
18.00 «Уральскія пельмені».
20.00 Серыял «Кухня».
23.30 «Цэнтральны мікрафон».

ІНТЭР+

7.00 Ток-шоу «Шустэр Live».
10.30 Смартшоу.
10.55 Дак. серыял «Містычная Украіна».
11.40, 22.20 Восеньская кухня.
12.25 Маст. фільм «Сакрэты фарватар» (1—4 с).
16.55 Маст. фільм «Дараванне».
18.15, 1.15 Легенды крымінальнага вышуку.
18.45, 1.50 Агенты ўплыву.
19.30, 2.35 Маст. фільм «Дзерцір».
21.00, 4.00 Падрабязнасці.
21.30, 4.30 Вялікая Розніца па-ўкраінску.
23.05, 6.50 Маст. фільм «Чыгунка».
0.45 Дак. фільм «Спецпадраздзяленне «Барс».
5.20 Маст. фільм «Птушкі нябесныя».

НАСТАЛЬГІЯ

5.00, 11.00 «Вакол смеху». 1980 год.
6.00 «Мы — маладая гвардыя. Свята юнацтва». Дак. фільм.
6.40, 12.35, 0.40 «Гэта было ў Какандзе». Маст. фільм.
7.45 «Хто ты, Джордж Бондджавані?». Дак. фільм.
8.00, 14.00, 2.00 «Час».
9.00, 3.00 «Народжаныя ў СССР».
10.00, 4.00 «Шырэй круг». 1987 год.
12.00 «Мы жадаем шчасця вам». Дак. фільм.
13.40 «Лёд і фантазія». Дак. фільм.
15.00 «Колба часу».
16.00 «Кінапанарама». Фрагменты выпускаў 1981/88 гг.
17.00 «Быў час». 2009 год.
18.00 «Шэсць песень на біс». 1996 год.
19.05 «Сустрэчы для вас. Васіль Аксёнаў». 1993 год.
20.00 «Поле цудаў». 1991 год.
21.00 «Жоўтая субмарына». 1986 год.
22.00 «Ранішняя пошта». 1988 год.
23.00 «Эліта краіны Саветаў». Руслан Хасбулатаў.
0.00 «Кавалёва з правінцыі». Фільм-спектакль. 2-я частка. 1975 год.
1.30 «Мастак і паэт Міхаіл Гробман чытае свае вершы». 2005 год.
4.00 «Сустрэча з Анатолем Папанавым». Фільм-канцэрт. 1975 год.

EUROSPORT

8.30 Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг.
9.15, 13.30, 20.30, 2.00 Снукер. International Championship.
11.00, 20.00 Еўраспорт. Топ 10.
11.30, 17.15, 0.50 Футбол. Чэмпіянат свету (U 17). ААЭ.
23.00 Кірунак — спорт.
23.05 Баявыя майстэрствы.
0.45 Sport Excellence.
3.00 Тэхнічны перапынак.

КАМЕДЫЯ

5.00, 10.55, 17.00, 19.00, 2.05 Скетчком «Паміж намі».
5.15, 12.55, 21.00 Камедыя «У гадзіну ночы».
5.45, 13.20, 21.25 Камедыя «Трайная непрыемнасць».
6.15 Камедыя «Экстрэмальнае спатканне».
8.00, 16.00, 2.20 Камедыя «За экранам».
8.30, 16.30, 2.45 Камедыя «Ціхая вуліца».
9.00 Камедыя «Мой лепшы сябар».
10.40, 12.40, 15.40, 21.50, 3.10, 4.45 «Камедыянты. Лепшае».
11.15 Камедыя «Гэтае няпэўнае пачуццё».
13.50 Камедыя «У парку».
14.10 Камедыя «Сутэнёр».
17.20 Камедыя «Зачараваная Эла».
19.20 Дэтэктыў «К-9 — сабачая праца».
22.10 Камедыя «Любоўныя раны».
23.50 Мюзікл «Трое ў лодцы, не лічачы сабакі».
3.25 Камедыя «Оскар».

ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

2.00, 8.00, 14.00 Прыгоды «Жыццё і дзіўныя прыгоды Рабінзона Круза».
3.30, 9.30, 15.30 М/с «Незвычайны матч». М/ф «Паляванне на дыназаўрыка».
4.00, 10.00, 16.00 М/с «Воін Сандакан. Кароль тыграў». Казкі Андэрсена. «Русалачка». М/ф «Парася і вясна».
5.00, 11.00, 17.00 Фільм-казка «На залатым ганку сядзелі...». Зборнік м/ф. «Фальшывая нота». «Рабінзон і самалёт».
6.30, 12.30, 18.30 М/с «Нябесныя танцоры».
7.00, 13.00, 19.00 «Урокі цётачкі Савы». Зборнік м/ф. «Чароўная лякарства». «Качаня Цім». «Слаганя і пісьмо».

ТБ3

6.00 М/ф.
9.30, 5.15 Серыял «Сябры».
11.00 Маст. фільм «Кідалы ў гульні».
12.50, 3.30 Маст. фільм «Сказ пра тое, як цар Пётр арапа ажаніў».
14.45, 1.50 Серыял «Вар'яты».
16.45 М/ф «Рыа».
18.15 Маст. фільм «Сенсацыя».
20.10 Маст. фільм «Тарас Бульба».
22.45 Маст. фільм «Бунрако».
1.00 Серыял «Падмані мяне».

ТБ1000

5.00 Камедыя «Мноства».
7.05, 17.15 Драма «Марыя-Антуанета».
9.15 Камедыя «Юнацтва, якое бунтуе».
10.50 Драма «Павуцінне хлусні».
13.10, 23.20 Драма «Усмешка Моны Лізы».
15.15 Прыгоды «Пітэр Пэн».
19.30 Драма «Маладая Вікторыя».
21.20 Драма «Сёстры Магдаліны».
1.25 Драма «У пагоні за шчасцем».
3.25 Камедыя «Міс Ніхто».

ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.00 Меладрама «Залатыя нябёсы».
8.00 Меладрама «Снягір».
10.00 Меладрама «Выкрутасы».
12.00 Драма «Заўтра была вайна».
14.00 Драма «Слон».
16.00 Трагікамедыя «Душка».
18.00 Камедыя «Дзень радыё».
20.00 Трылер «Цёмны свет».
22.00 Камедыя «Канікулы строгага рэжыму».
0.00 Дэтэктыў «Шэрлак Холмс і доктар Ватсан: Знаёмства».
1.20 Дэтэктыў «Шэрлак Холмс і доктар Ватсан: Крывавы надпіс».
2.40 Камедыя «Асаблівасці нацыянальнай падлёднай лоўлі, або Адрыў па поўнай».
4.10 Камедыя «Майскі дождж».

NATIONAL GEOGRAPHIC

5.00 Кракадзілы Катумы.
6.00, 8.00 Дзікі тунец.
7.00 Рабі стаўкі і ўзрывай.
9.00 Каралі рыбалкі.
10.00, 13.00, 18.00 Гульні розуму.
11.00 Дзіўнае побач.
12.00 Міжнародны аэрапорт Дубай.
14.00 Мегапераезды жывёл.
15.00 Астравы.
16.00 Золата горада-прывіда.
17.00 Падарожжа на караблі Сіндбада-марахода.
19.00 Шукальнікі скарбу.
20.00, 0.00, 3.00 Сакрэтныя матэрыялы старажытнасці.
21.00, 1.00, 4.00 Забароны.
23.00, 2.00 Расследаванні авіякатастроф.

НЯДЗЕЛЯ, 3 ЛІСТАПАДА

БЕЛАРУСЬ 1

7.35 Містыка «Вій».
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.10 Арсенал.
9.35, 0.35 Камедыя «Ластаўчына гняздо».
12.10 «Зона Х».
12.45 Каробка перадач.
13.20 Урачэбныя тайны.
13.50 Заўтра — гэта мы!
14.25 "Terra incognita. Беларусь невядомая".
15.15 Навіны рэгіёна.
15.30 Клуб рэдактараў.
16.15 БеларусьLIFE.
16.40 Давярай і правярай.
17.10 Камедыя «Тэрнер і Хуч».
19.00 Трылер «Дамавік».
21.00 У цэнтры ўвагі.
21.55 Журналісцкае расследаванне.
22.30 Баявік «Дзжа вю».

БЕЛАРУСЬ 2

7.50 Серыял «Госця з будучыні». Заключныя серыі.
11.00 Тэлебарометр.
11.05 Камедыя «Віктар».
13.00 Дэтэктыў «Карчма на Пятніцкай».
14.45, 23.05 Серыял «Таксі».
16.00 «Жаночая ліга. Бананавы рай».
16.30 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА.
17.10 Камедыя «Утаймавальніца тыграў».
19.15 Суперлато.
20.25 Навіны надвор'я.
21.00 Спортлато 5 з 36.
21.05 КЕНО.
21.10 Драма «Бывай, мая каралева!».
0.05 Спорт-кадр.

БЕЛАРУСЬ 3

8.00, 12.40, 15.00, 23.30 «Калейдаскоп».
8.05 «Таямніцы душы».
8.35 «Кожны мае права быць розным». Бязмежныя людзі.
9.00 «Купала і Колас. Два яблыкі на адной галінцы». Дак. фільм.
9.30 «Гэты дзіўны свет. Чэслаў Немен». Дак. фільм.
10.00 «Набіраючы вышыню». Дак. фільм.
10.30 «Георгій Жукаў. Вайна і мір Маршала Перамогі». Дак. фільм.
11.00 «Адступнік». Дак. фільм пра кінарэжысёра Валерыя Рубінчыка.
11.20 «Скульптар». Дак. фільм пра А. Арцімовіча.
11.45 «Карані».
12.10 «Плошча мастацтваў». Зінаіда Зубкова.
12.45 «Уся каралеўская раць». Маст. фільм.
16.10 «Без права на дубль». Уладзімір Мігуля.
17.00 Дзіцячы фільм. «Неадкрытыя астравы».
18.05, 21.35 «Культпрасвет».
18.30 Сусветнае кіно. «Сямейны партрэт у інтэр'еры».
20.30 Калыханка.
20.45 «Альпійская балада». Фільм-опера.
22.05 «Сымон-музыка». Тэлеспектакль паводле аднайменнай паэмы Якуба

■ Жывая зямля

Падзея ў прыродзе Беларусі, схаваная ад вачэй гарадскіх жыхароў, — адлёт жураўлёў. Сёлета ён супаў з заканчэннем бабінага лета — сярэдзінай кастрычніка. Калі птушкі пакідаюць Ельню — свой заўсёдны прыстанак на нашай зямлі, іх журботныя галасы даносяцца з усіх куточкаў вялікага балота, з навакольных палеткаў, з зацягнутага цяжкімі хмарамі паднябесся.

ПАД ЖУРАЎЛІНЫМІ КРЫЛАМІ

На поўдзень кліча дарога птушак, у далёкі вырай, куды не сягаюць зімовыя сцюжы. Амаль два тыдні сумнакрылыя птахі гасцявалі на беларускай зямлі, падмацоўваліся, адпачывалі, набіраліся сілы. Удзень карміліся на прыбраных кукурузных палетках, утвараючы сапраўдныя калоніі. Увечары, калі да скону дня заставалася не больш за паўгадзіны, асобнымі чародамі адляталі на больш бяспечныя яльнянскія выспы. І вось, развітваючыся, жураўлі робяць у небе кола за колам і ўзносяцца ўсё вышэй і вышэй, нібы спрабуюць свае адпачыўшыя крылы ў порстких ветравых патоках. Пранізлівае курлыканне паволі слабее і ўжо ледзь чутно з вышыні, пакуль, нарэшце, зусім не знікае. Нізкія аблокі хаваюць ад вачэй апошні журавіны клін...

Сёлета ў ваколіцах заказніка «Балота «Ельня» прайшоў штогадовы падлік гэтых птушак. Назіранне праводзілася напрыканцы верасня з розных кропак вакол балота. Было выяўлена, што Ельня стала месцам адпачынку амаль для 7 тысяч жураўлёў — гэта найбольшая іх колькасць за ўвесь час назіранняў. Вядома, што гэтыя жураўлікі — пераважна мігранты з поўначы Расіі. І зусім невялікая частка — прадстаўнікі мясцовай папуляцыі, якая гнездавалася на тэрыторыі і славутага заказніка, і іншых балот Віцебшчыны.

Каб паназіраць за жураўлямі ў месцах, дзе іх найбольшая колькасць увосень, прыйшлося загадзя будаваць спецыяльныя буданы-схованкі. Сёлета некалькі соцень птушак доўга трымаліся на палетках у паўночна-заходнім баку ад Ельні — на памежжы Мёрскага і Шаркаўшчынскага раёнаў. На ўскрайку аднаго з палёў з убранай кукурузай, узвёўшы з вецця і сухой травы невялікае ўкрыццё, давялося некалькі дзён запар па шэсць-восем гадзін правесці ў нерухомым чаканні, каб рабіць фотаздымкі з блізкай адлегласці: настолькі гэтая птушка асцярожная і палахлівая. Цярпенне не было дарэмным: у адзін з дзён побач з вёскай Більдзюгі жураўліная чарада наблізілася да маёй схованкі амаль на паўсотню метраў. Было добра відаць, як паміж птушкамі ўзнікалі спрэчкі і справа даходзіла да боек крыламі і дзюбамі. Не раз яны пачыналі танцаваць адзін перад адным, высока падскокваючы. Напэўна гэтак сярод мацнейшых вызначаюцца важакі, якім давядзецца выконваць ролю капітанаў на доўгім шляху ў вырай.

У наступны дзень чаканне журавоў каля вёскі Новы Пагост было марным: птушкі не нагадалі пра сябе нават сумнай песняй. Значыць, жураўлі, усе да апошняга, адляцелі ў вырай. Яны нібы адчувалі набліжэнне халадоў: праз некалькі дзён на Віцебшчыне сапраўды выпаў першы снег.

Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.

■ Працяг тэмы

ПАРАВОЗЫ ЯШЧЭ ПАПРАЦУЮЦЬ?

Ідэя рэтрацягніка пакуль «саспявае»

Паслугамі Гродзенскага чыгуначнага вакзала аўтару гэтых радкоў даводзілася карыстацца неаднойчы. Але так, як 27 снежня мінулага года, — упершыню. Цягнік «узначальваў» паравоз, а машыніст, яго памочнік і кандуктар былі ў форменным адзенні XIX стагоддзя. Білет у вагон першага класа, са штампам Санкт-Пецярбургска-Варшаўскай чыгункі каштаваў з Гродна да станцыі Парэчча 70 капеек серабром. Кандуктар, як і мае быць, цікавілася наяўнасцю праязных дакументаў і жадала пасажырам (гэта былі ветэраны, сённяшнія работнікі Беларускай чыгункі і журналісты) шчаслівай дарогі. Аркестр, гудкі паравоза...

А ўсё таму, што ў гэты дзень наша чыгунка адзначала сваё 150-годдзе. Да юбілею аднавілі два паравозы, пашылі «гістарычныя» касцюмы. Невыпадковы быў і святочны маршрут, па якім накіраваўся рэтрацягнік: 32-кіламетровы ўчастак з Гродна да Парэчча — гэта першынец чыгуначнай магістралі на беларускіх землях.

Па шляху ў Парэчча цягнік вітаў гудкамі прыпыначная пункты, экскурсавод узгадвала старонкі з гісторыі айчыннай чыгункі і яе першага ўчастка. А галоўныя падзеі свята разгарнуліся на канцавой станцыі, на пероне каля будынка аднаго са старэйшых у Беларусі вакзалаў. Неўзабаве туды прыбыў яшчэ адзін «гістарычны» цягнік, і са стылізаванага пад даўніну вагона выйшлі генерал-маёр Герстфельд, які кіраваў работамі на будаўніцтве гэтай магістралі, і іншыя афіцыйныя асобы з Санкт-Пецярбурга. Тэатралізаваная імпрэза з нагоды юбілею адкрыцця першага ўчастка Беларускай чыгункі ўдалася на славу. Пра яе расказалі многія СМІ, у тым ліку і «Звязда». Пры гэтым шмат гаварылася пра далейшае выкарыстанне рэтрацягніка ў турыстычных мэтах.

Аднак свята завяршылася, паравозы далі развітальныя гудкі і рушылі назад у Баранавічы, дзе знаходзяцца і цяпер. Няўжо цікавая задумка абмяжуецца толькі макетам паравоза, устаноўленым каля вакзала ў Парэччы, а сапраўдныя паравозы будуць чакаць наступнага юбілею?

Дацэнт Гродзенскага дзяржаўнага аграрнага ўніверсітэта, кандыдат тэхнічных навук Сяргей ЛАДУЦЬКА, у прыватнасці, прапанаваў:

— Можна даставіць адзін з паравозаў (з рэтравагонам) на станцыю «Раённая», што побач з вуліцай Белыя Росы ў Гродне. Ездзіць далёка на старых паравозах будзе вельмі дорага (хіба што па замове кампаніі багатых турыстаў), а вось пакатацца ў межах названай станцыі — гэта рэальна. Няхай дзеці і ўсе ахвотныя паглядзяць, што такое паравоз.

Сяргей Мікалаевіч з задавальненнем пазнаёміў бы з паравозам і сваіх студэнтаў, бо моладзь ужо не ведае пра рухавікі такога тыпу.

Прапановы нашага чытача былі разгледжаны Беларускай чыгункай, пра што рэдакцыі паведаміў **першы намеснік начальніка Віктар МІХАЙЛЮК**:

— Работы, звязаныя з развіццём турыстычнай дзейнасці, забяспечваюць турцэнтры «Дартур» Мінскага і Брэсцкага аддзялення Беларускай чыгункі. Прыярытэтам у працы гэтых падраздзяленняў з'яўляецца арганізацыя ўязнога і ўнутранага турызму з максімальным выкарыстаннем чыгуначнага транспарту... Сёння Беларуская чыгунка мае магчымасць арганізацыі турыстычных маршрутаў з «удзелам» рэтрацягнікоў. Для гэтых мэт могуць быць задзейнічаны два паравозы, якія выкарыстоўваліся ў мерапрыемствах з нагоды святкавання 150-годдзя Беларускай чыгункі на ўчастку Гродна-Парэчча. У выпадку наяўнасці попыту на арганізацыю чыгуначных турыстычных маршрутаў, у тым ліку з выкарыстаннем паравознай цягі, Беларуская чыгунка гатова разгледзець магчымасць і ажыццявіць гэтыя перавозкі.

Такім чынам, паравозы ёсць, магчымасці для іх выкарыстання ў турыстычных мэтах і адпаведныя структуры — таксама. І «ў выпадку наяўнасці попыту»... А вось тут варта задумацца. Ад каго ж павінна зыходзіць ініцыятыва? Няўжо не ад арганізатара паслугі? Менавіта яго задача — распрацаваць і прапанаваць кліенту варыянты і ўмовы рэалізацыі гэтага праекта, зацікавіць канкрэтным турыстычным прадуктам. Інакш аб якім попыце на маршруты з выкарыстаннем тых жа паравозаў можна казаць? Гэта як у краме: новы тавар спачатку прапануюць праводзіць актыўную рэкламную кампанію, а ўжо потым рэагуюць на запыты, пажаданні пакупнікоў, уносяць тыя ці іншыя карэктывы.

Замежнага вопыту ў «рэтрачыгуначнай» сферы хапае. У Славакіі, напрыклад, 30 гадоў таму закрылі Чарнагорскую вузкакалейку. Рэйкі і рухомы састаў павінны былі дэмантаваць. Аднак грамадскія актывісты прапанавалі іншы варыянт, які стаў даволі паспяховым бізнес-праектам. Паравозы і гістарычныя вагоны з мая па кастрычнік абслугоўваюць сотні турыстаў: можна заказаць экскурсіі, групавыя паездкі, спецыяльныя дзіцячыя туры.

Добрыя прыклады ў гэтым кірунку ёсць і ў Польшчы. Літаральна па-суседску з Гродзеншчынай, на Сувальшчыне, да пачатку 1990-х аказалася амаль закінутай, але потым вярнулася да жыцця Вігерская вузкакалейная чыгунка. Калісьці па ёй перавозілі драўніну, а цяпер, калі вырубка лесу ў гэтай зоне забаронена, возяць турыстаў, каля 20 тысяч штогод. Па маршруце руху, які праходзіць праз лясы Аўгустоўскай пушчы і Вігерскага нацыянальнага парку, абсталяваны аглядныя пляцоўкі. У ліпені і жніўні вузкакалейка працуе штодзённа, а ў астатнія месяцы — па групавых заказах. У штаце — некалькі пастаянных работнікаў і з дзясятак сезонных (у асноўным студэнтаў), занятых улетку на пуцявых работах.

Але вернемся да прапановы Сяргея Ладуцькі па размяшчэнні аднаго з паравозаў у Гродне. На жаль, у вышэйзгаданым афіцыйным адказе з Беларускай чыгункі пра гэта ні слова. Дык што, адсвяткавалі з паравозам і хопіць з яго?

Цяпер у Гродне безумоўны прыярытэт — развіццё чыгуначнага вузла, сур'ёзная рэканструкцыя вакзала. Але і ад ідэі рэтрацягніка ў турыстычных мэтах не адмовіліся, паведаміў **намеснік начальніка аб'яднанай станцыі Гродна Канстанцін САКОВІЧ**. Ён удзячны Сяргею Мікалаевічу за ягоную прапанову і лічыць яе ажыццяўленне цалкам рэальным — можа, не на станцыі «Раённая», а ў іншым месцы з больш маляўнічымі краявідамі. Ужо разглядаліся і варыянты выкарыстання рэтрацягніка як сегмента нейкага турыстычнага маршруту. Напрыклад, група турыстаў наведвае гістарычныя славутасці Прынямоння, і як эксклюзіў ім прапануюць паездку ў цягніку з паравозам па першым участку Беларускай чыгункі. Планавалася нават такая паслуга, каб турыст пры жаданні мог пераапрануцца і пакідаць у топку вугалёк.

А спачатку, кажа Канстанцін Саковіч, трэба стварыць інфраструктуру для абслугоўвання рэтрацягніка, запасы вугалю, падабраць штат людзей, падрыхтаваных кіраваць гэтым відам рухомага саставу. І, вядома, распрацаваць канцэпцыю турыстычнага прадукту, пралічыўшы яго эканоміку.

Ідэя выкарыстання рэтрацягніка не толькі па значных юбілейных датах яшчэ «саспявае»...

Барыс ПРАКОПЧЫК

■ На кантролі

СКАРДЗЯЦЦА? ПРАВЯРАЙЦЕ І АДКАЗВАЙЦЕ!

Сёлета ў Віцебскай вобласці за парушэнні пры разглядзе зваротаў, унесеных у кнігу заўваг і прапаноў, да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнулі дзевяць адказных асоб, да дысцыплінарнай — шэсць. Агульная сума штрафаў склала 3,1 мільёна рублёў.

— Запіс у кнігу прыраўноўваецца да пісьмовага звароту. І парадак яго разгляду рэгламентаваны законам аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб. А парадак вядзення кнігі заўваг і прапаноў зацверджаны пастановай урада. Усе дзеянні службовых асоб пры рабоце з такімі зваротамі выразна рэгламентаваны. Парушэнне ўстаноўленага тэрміну разгляду заўваг і прапаноў альбо не інфармаванне грамадзяніна ва ўстаноўлены тэрмін аб адмове ў задавальненні заўвагі ці прапановы цягнуць за сабой папярэджанне або накладанне штрафу — ад чатырох да дзесяці базавых велічынь, — нагадалі ў Камітэце дзяржкантролю Віцебскай вобласці.

Падчас кантрольных мерапрыемстваў выяўлена нямала парушэнняў.

Напрыклад, у Віцебскім гарвыканкаме не ўнеслі ў кнігу звесткі аб выніках разгляду скаргі. Калі заяўнік праз месяц пры паўторным наведванні не ўбачыў адпаведнага запісу, ён напісаў новую скаргу, але ўжо кантралёрам. Вінаватую службовую асобу прыцягнулі да адміністрацыйнай адказнасці.

А ў віцебскай ВНУ не разгледзелі адразу дзве скаргі, унесеныя ў кнігу наведвальнікам інтэрната. У кнізе быў зроблены запіс аб растлумачэнні яму правілаў знаходжання ў інтэрнаце. Аднак пісьмовы адказ па выніках разгляду скаргаў накіраваны не быў. Службовая асоба, адказная за вядзенне кнігі заўваг і прапаноў, заплаціла штраф.

— Падчас праверкі гэтага факта высветлілася, што ў ВНУ ўвогуле не быў вызначаны алгарытм дзеянняў пры паступленні скаргаў у кнігу заўваг і прапаноў. Напрыклад, як дзейнічаць загадчыцы інтэрната пры паступленні скаргі, калі саму кнігу нельга забіраць з месца захоўвання, але пры гэтым неабходна паказаць скаргу кіраўніку для прыняцця рашэння па яе разглядзе, — растлумачылі нюансы ў кантрольным ведамстве.

У выніку маніторынгу ў іншых інтэрнатах той жа ВНУ таксама выявілі шэраг парушэнняў у арганізацыі працы з кнігамі заўваг і прапаноў. Для двух інтэрнатаў універсітэта была заведзена адна кніга, у той час як заканадаўствам прадугледжана вядзенне кнігі ў кожным адасобленым падраздзяленні арганізацыі, размешчаным па-за месцам яе знаходжання... Па выніках маніторынгу кіраўніку ўстановы адукацыі накіравалі рэкамендацыі па ліквідацыі выяўленых парушэнняў і недахопаў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

У ВІЦЕБСКУ АКТЫЎНА «ЎЗЯЛІСЯ» ЗА ДВАРЫ

У Віцебску рэалізоўваецца маштабная і ўнікальная праграма «Дворы». Ініцыятарам навядзення парадку ў дварах стаў Аляксандр Косінец, старшыня Віцебскага аблвыканкама.

Ён патрабуе, каб у сталіцы міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» было прыгожа паўсюды. Губернатар даручыў кіраўніцтву гарвыканкама, не спасылаючыся на фінансавыя цяжкасці, шчыльна ўзяцца за добраўпарадкаванне дваравых тэрыторый.

Ужо заменены асфальт у больш як 130 дварах. Агульная плошча адрамантаваных дваравых тэрыторый — каля 38 тысяч квадратных метраў. На рамонт патрацілі больш як 2,8 мільярда рублёў.

Але, лічаць гараджане, радавацца яшчэ рана. У абласным цэнтры прыблізна 1,6 тысячы двароў, то яшчэ трэба значна папрацаваць.

Адказныя асобы канстатуюць, што дворы прыводзяцца ў парадак не толькі ў цэнтральнай частцы горада.

— Праца па добраўпарадкаванні дваровых тэрыторый ідзе не на словах, а на справе. Аднак дзейнасць у гэтым кірунку патрабуе пастаяннага кантролю. Трэба скончыць пачатае і працягнуць запланаванае — добраўпарадкаваць ускраіны горада. Гэтая праца пачалася, — пракаментаваў выкананне праграмы «Дворы» **Мікалай СМУНЁЎ, старшыня Віцебскага гарсавета дэпутатаў**.

У гарсавеце лічаць, што пры асфальтаванні вулачак і двароў можна было б значна эканоміць, калі б у камунальнікаў, якія адказваюць за дворы, з'явіўся невялікі завод па вырабе асфальту. Гэта дазволіла б абыходзіцца без паслуг падрадных арганізацый, якія выконваюць заказы па асфальтаванні.

Аляксандр ПУКШАНСКІ

■ Ёсць пытанне!

ЧЫМ ПАХНЕ «САРЫЯ», або Пасляслоўе да аднаго звароту

У рэдакцыю газеты паступіў электронны зварот ад імя жыхароў вёсак Сігневічы, Марэвіль, Падвоссе Бярозаўскага раёна. Аўтар звароту Генадзь Васілюк паведаміў пра суседства з прадпрыемствам «Сарыя Бія-Індастрыс», ад якога церпяць усе вяскоўцы. *«Увесь гэты час мы вымушаны дыхаць едкімі газамі, якія ідуць з боку прадпрыемства. Ужо другі год на палі бліжэйшага калгаса вывозяць брудную жыжу... Раней у недалёкай сажалцы нават жыла рыба, цяпер тут смярдзючае балота...»* Праз некаторы час рэдакцыя і заяўнік атрымалі адказы прыродаахоўных ведамстваў, Бярозаўскага райвыканкама. Але спадар Васілюк застаўся незадаволены адказамі, напісаў, што яны падобныя на адпіскі, бо тую жыжку як вазілі на палеткі, так і возяць. *«І як можна вазіць такія стокі на палі, калі ў краіне афрыканская чума?»* — заключае свой ліст аўтар.

Пачну з таго, што замежнае прыватнае вытворчае гандлёвае ўнітарнае прадпрыемства «Сарыя Бія-Індастрыс» знаходзіцца недалёка ад вёскі Падвоссе за 17 кіламетраў ад горада Бяроза. Яно займаецца зборам і перапрацоўкай адходаў жывёльнага паходжання, з якіх вырабляюцца харчовыя дабаўкі для жывёлы — такія, як мяса-косная мука, тлушч і іншыя. На прадпрыемстве ёсць лакальныя ачышчальныя збудаванні для ачысткі прамысловых і гаспадарча-бытавых сцёкавых вод. Сабраны ў выніку ачысткі актыўны глей падаецца па напорным трубаправодзе на спецыяльныя пляцоўкі. Ачышчаныя сцёкі паступаюць для даачысткі на біялагічныя сажалкі... Абёмы вытворчасці ў прадпрыемства вялікія, а значыць, і адходаў утвараецца шмат. Зразумела, паўстала пытанне аб іх утылізацыі. Таму, цытую адзін з афіцыйных адказаў: *«У адпаведнасці з пісьмом Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя РБ ад 14.10 2010 года, разгледжана магчымасць скідвання вытворчых сцёкавых вод прадпрыемства «Сарыя Бія-Індастрыс» на перыяд рэканструкцыі ачышчальных збудаванняў у жыжказборнікі СВК «Вінец»*.

Фактычна ж гэты глей не накіроўваецца ў жыжказборнікі сельгаспрадпрыемства, а вывозіцца на палі ў якасці арганічнага ўгнаення.

Кіраўнік СВК «Вінец» Яўген Шымчук сказаў карэспандэнту «Звязды», што яны за бяспеку арганікі не апасаюцца, бо первічныя аналізы, праведзеныя адпаведнымі службамі, ніякіх перавышэнняў дапушчальнай канцэнтрацыі шкодных рэчываў не выявілі. Больш за тое, «Сарыя» рыхтуе да заключэння дагавор з Палескім аграрна-экалагічным інстытутам Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі — па распрацоўцы тэхнічных умоў прымянення актыўнага глею ў якасці дабаўкі для глебы. Навукоўцы з вышэйзгаданага інстытута ўжо не раз бывалі на палях СВК «Вінец», для любога абгрунтаванага заключэння трэба некалькі гадоў даследаў, эксперыментаў, аналізаў. Так што афіцыйны дакумент можа з'явіцца на свет не раней чым праз некалькі гадоў. А пакуль...

Нельга не пагадзіцца з Яўгенам Пятровічам Шымчуком у тым, што такое прадпрыемства нашай краіне было неабходна. «Сарыя» перапрацоўвае тое, што ў многіх месцах гніло на звалках, а часам вывозілася ў навакольныя лясы, гніло ў кар'ерах за жывёлагадоўчымі комплексамі. Ніводзін жывёлавод не застрахаваны ад падзяжу жывёлы, якую трэба ўтылізаваць цывілізавана. Машыны прадпрыемства забіраюць нежывую жывёлу з некалькіх абласцей рэспублікі і прывозяць на перапрацоўку ў Бярозаўскі раён.

А вось за правільную ўтылізацыю ўжо сваіх уласных адходаў адказвае само прадпрыемства. Другая праблема — паветра: глей з вільготнасцю больш за 70% мае спецыфічны пах, мякка кажучы, не вельмі прыемны. Таму і пішуць людзі ў розныя інстанцыі. Нельга сказаць, што нічога не робіцца на прадпрыемстве для памяншэння наступстваў выкідаў у атмасферу. У канцы мінулага года быў устаноўлены іонаабменны фільтр для выдалення непрыемных пахаў, якія ўтвараюцца падчас тэхналагічнага працэсу, што паменшыла выкід смуроду ў атмасфернае паветра.

Пра гэта гаворыцца ў афіцыйным адказе Брэсцкага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Там жа пазначана, што Брэсцкай абласной лабараторыяй Рэспубліканскага цэнтра аналітычнага кантролю ў галіне аховы навакольнага асяроддзя сістэматычна вядзецца кантроль выкідаў у атмасферу ад стацыянарных крыніц прадпрыемства. Перавышэнняў нарматываў не ўстаноўлена.

Дарэчы, у дзень наведвання аўтарам гэтых радкоў вёсак Падвоссе, Сігневічы, Вінін *(21 кастрычніка.* — **Аўт.**) у населеных пунктах нікакага спецыфічнага паху не адчувалася. Гэта не азначае, што яго не бывае наогул: усё залежыць ад напрамку ветру. Зменіцца вецер — і прынясе смурод з біясажалак «Сарыі». Што тут скажаш: людзям, што жывуць па-суседстве з такім прадпрыемствам, не пашанцавала...

Няма сумнення ў тым, што ў кожным з адказаў, якія атрымалі аўтар звароту і газета, змяшчаецца праўдзівая інфармацыя, але ж меры, якія прымала прадпрыемства і кантралюючыя органы, яўна недастатковыя. Перачытваючы адказы, прыходзіш да высновы, што знайсці тлумачэнне можна ўсяму. Тым больш, калі гутарка ідзе аб прадпрыемстве, якое патрэбна краіне і з'яўляецца бездакорным падаткаплацельшчыкам у раённы бюджэт. Напэўна, нездарма еўрапейскі бізнесмен адкрыў тут сваю вытворчасць. Таму што ў сябе на радзіме заняцца падобным было б складана і вельмі дорага. Там, калі нешта не так, прыродаахоўныя органы завальваць штрафамі і санкцыямі. У нас жа і заканадаўчая база, і грамадская экалагічная свядомасць крыху на іншым узроўні. Значыць, сам бізнес павінен гэта ўлічваць і рабіць усё магчымае для мінімізацыі негатыўных наступстваў сваёй вытворчасці.

Напэўна, нездарма еўрапейскі бізнесмен адкрыў тут сваю вытворчасць. Таму што ў сябе на радзіме заняцца падобным было б складана і вельмі дорага.

На «Сарыі» гэта не адмаўляюць. Вось што сказаў карэспандэнту газеты галоўны інжынер прадпрыемства «Сарыя Бія-Індастрыс» Ігар Крэйдзіч:

— Зараз мы ажыццяўляем праект па рэканструкцыі прадпрыемства — і ў прыватнасці,і рэканструкцыі лакальных ачышчальных збудаванняў. Завяршэнне работы выведзе на новы якасны ўзровень ачыстку стокаў. Дарэчы, згодна з першапачатковым планам, новыя ачышчальныя павінны былі ўжо дзейнічаць, але нас падвялі пастаўшчыкі абсталявання і работа зацягнулася. Абсталяванне ўжо атрымана, вядзецца яго наладка. Працэс гэты надзвычай складаны і адказны, фарсіраваць яго мы не можам, бо ўсё павінна працаваць бездакорна. Таму, калі не ўдасца скончыць мантаж і наладку сёлета, будзем даводзіць яе да толку ў наступным годзе, каб ачышчальныя збудаванні функцыянавалі без збояў. Калі ўсе ўказаныя прыстасаванні для ачысткі паветра і сцёкаў будуць гатовы, негатыўны ўплыў на навакольнае асяроддзе звядзецца да мінімуму.

Заявы наконт пагрозы распаўсюджвання афрыканскай чумы Ігар Крэйдзіч лічыць неабгрунтаванымі.

І ўсё ж гарантаваць, што жыхары навакольных вёсак у любое надвор'е не будуць адчуваць дрэнны пах з боку прадпрыемства, ніхто не можа. Людзі аказаліся міжвольнымі заложнікамі спецыфічнай вытворчасці. Відаць, у свой час мясцовай уладзе трэба было праявіць большую ўвагу і лепш выбіраць пляцоўку. Але цяпер ужо і пляцоўку не памяняеш, і вытворчасць не перанясеш. Можна хіба што пасадзіць больш дрэў, загарадзіць населеныя пункты зялёнымі паглынальнікамі паху, а таксама, не лічачыся з затратамі, набываць самыя сучасныя фільтры. І тут прынцыповасць і настойлівасць павінна праяўляць мясцовая ўлада.

Але ж, калі меркаваць па адказе, атрыманым з райвыканкама, — там знаходзяцца ў палоне пэўных ілюзій, бо пішуць пра магчымае ўжо сёлета(!) добраўпарадкаванне і зарыбленне біясажалак і вадаёма каля іх. Цікава, якая рыба там можа жыць, калі нават дрэвы вакол вадаёма засохлі? Але ж марыць пра тое, што напісана, і набліжаць гэтую мару канкрэтнымі адміністрацыйнымі дзеяннямі, вядома, не забараняецца.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Бярозаўскі раён

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ГРАЖДАНАМ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

29 ноября 2013 г. в 10.00 в здании Подлабенского сельского исполнительного комитета (аг. Подлабенье, ул. Солнечная, 17) состоится аукцион по продаже в частную собственность гражданам Республики Беларусь земельных участков для строительства и обслуживания жилых домов

Номер лота	Кадастровый номер и адрес земельного участка	Площадь земельного участка, га	Начальная цена предмета аукциона, бел. руб.	Подлежащие возмещению расходы, связанные с проведением аукциона, подготовкой документации, необходимой для его проведения, бел. руб.	Инфраструктура и условия инженерного развития земельных участков
1	2	3	5	6	7
1	422080415101000073, Гродненская область, Гродненский район, Подлабенский с/с, д. Соловьи, У – 1/А	0,1203	8 660 770	4 700 000	Примыкание участка к асфальтным дорогам
2	422080415101000074, Гродненская область, Гродненский район, Подлабенский с/с, д. Соловьи, У – 2/Б	0,1208	8 696 800	4 700 000	Примыкание участка к асфальтным дорогам
3	422080415101000075, Гродненская область, Гродненский район, Подлабенский с/с, д. Соловьи, У – 3/В	0,1191	8 574 300	4 700 000	Примыкание участка к асфальтным дорогам
4.	422080415101000076, Гродненская область, Гродненский район, Подлабенский с/с, д. Соловьи, У – 4/Г	0,1086	7 818 400	4 700 000	Примыкание участка к асфальтным дорогам
5.	422080415101000077, Гродненская область, Гродненский район, Подлабенский с/с, д. Соловьи, У – 5/Д	0,0924	6 659 300	4 700 000	Примыкание участка к асфальтным дорогам

Целевое назначение земельных участков: для строительства и обслуживания жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания).

Для участия в аукционе гражданин (лично либо через своего представителя) со дня опубликования настоящего извещения и **до 17.00 27 ноября 2013 г.** представляет в комиссию по организации и проведению аукциона по адресу: **аг. Подлабенье, ул.Солнечная, 17,** документы:

заявление на участие в аукционе с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка;

копию платежного поручения о внесении задатка в размере 10% от начальной цены предмета аукциона (для земельного участка № У – 1/А – 866 077 белорусских рублей, для земельного участка № 2/Б – 869 680 белорусских рублей, для земельного участка № У – 3/В – 857 430 белорусских рублей, для земельного участка № У – 4/Г – 781 840 белорусских рублей, для земельного участка № У – 5/Д – 665 930 белорусских рублей) на расчетный счет ГУ МФ РБ по Гродненской области Подлабенский сельисполком, № 3600514090147 в филиал № 400 АСБ «Беларусбанк» г. Гродно, код 752, назначение платежа 04901, УНН – 500563252, с отметкой банка о его исполнении;

гражданин – копию документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

представитель гражданина – нотариально удостоверенную доверенность.

Контактные телефоны: **(8-0152) 930 670, (8-0152) 930 646, (8-0152) 930 619**.

Аукцион проводится при наличии не менее двух участников. Аукцион проводится в порядке, определенном Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденными постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:

в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания его несостоявшимся, внести плату за земельный участок на расчетный счет ГУ МФ РБ по Гродненской области Подлабенский сельисполком, № 3600514090147 в филиал № 400 АСБ «Беларусбанк» г. Гродно, код 752, назначение платежа 04901, УНН – 500563252, а так же возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением документации, необходимой для его проведения (суммы, указанные в графе 6, подлежат корректировке исходя из фактических затрат) на расчетный счет ГУ МФ РБ по Гродненской области Подлабенский сельисполком, № 3600514090147 в филиал № 400 АСБ «Беларусбанк» г. Гродно, код 752, назначение платежа 04616, УНН – 500563252.

Шаг аукциона – 10% от предыдущей цены, называемой аукционистом.

Управляющий в производстве по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) ООО «Центр правовых услуг» проводит повторный открытый аукцион по продаже недвижимого имущества Общества с дополнительной ответственностью «КонсалтЛизинг»:

№ лота	Наименование имущества	Ед. изм.	Кол-во	Начальная цена предмета торгов	Сумма шага аукциона в размере 5%, руб.
1	Изолированное помещение с инвентарным номером 100/D-73866 общей площадью 498,4 кв.м, расположенное по адресу: г. Брест, ул. Задворская, 4	шт.	1	1176836642	58841832
	Стоимость 1 лота			1176836642	58841832

Повторный аукцион состоится **12 ноября 2013 года в 10.00** по адресу: г. Брест, ул. Ясеневая, 20А, офис 203.

Заявления на участие в повторном аукционе с приложением копий свидетельств о государственной регистрации, доверенностей, выданных представителю (для юридических лиц и ИП), или копий паспортов (для физических лиц), заверенных банком документов, подтверждающих внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет ОДО «КонсалтЛизинг», принимаются по **11 ноября 2013 года** до 17.00 по адресу: г. Брест, ул. Ясеневая, 20А, офис 203 или по факсу 80162-33-93-88.

Шаг аукциона равен пяти процентам от начальной цены имущества. Начальная цена установлена без НДС. Договор купли-продажи между Продавцом и Покупателем заключается в течение 7 (семи) дней с даты проведения торгов. Победитель аукциона обязан оплатить предмет торгов в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее тридцати дней со дня проведения торгов. Победитель аукциона возмещает расходы, связанные с проведением торгов в части оплаты объявления о проведении торгов в течение 5 дней с даты проведения торгов.

Размер задатка для участия в аукционе составляет 10% от начальной цены имущества и перечисляется на расчетный счет ОДО «КонсалтЛизинг» № 3011356050012 в Региональной дирекции № 500 ЗАО «Банк ВТБ» (Беларусь), г. Брест, МФО 153001108, УНП 290307191 в срок до **11 ноября 2013 года** до 17.00.

Победителем аукциона признается лицо, предложившее наиболее высокую цену за лот.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Результаты по проведению торгов оформляются протоколами.

Сведения об организаторе торгов: Общество с ограниченной ответственностью «Центр правовых услуг», юридический адрес: 224022, г. Брест, ул. Ясеневая, 20А, офис 203, контактные телефоны: 80162-33-93-88, 8029-802-80-00.

Сведения о продавце: Общество с дополнительной ответственностью «КонсалтЛизинг», юридический адрес: г.Брест, ул. Задворская, 4, контактные телефоны: 80162-33-93-88, 8029-802-80-00.

Организатор открытых торгов после опубликования извещения о проведении торгов вправе отказаться от их проведения при продаже имущества должника на аукционе – в любое время, но не позднее чем за пять дней до наступления даты его проведения.

Иную информацию о порядке и условиях проведения торгов, ознакомлении с предметом торгов можно получить в рабочие дни с 9.00 до 17.00 по адресу: 224022, г. Брест, ул. Ясеневая, 20А, офис 203, тел./факс 80162-33-93-88.

В суд Октябрьского района г. Могилева поступило заявление о признании безвестно отсутствующим КОЛОЛА Виталия Викторовича, 16.12.1985 года рождения, уроженца г. Светлогорска Гомельской области, проживавшего до октября 2011 года по адресу: Гомельская область, г. Светлогорск, м-н «Октябрьский», д. 57, кв. 94. Просьба ко всем юридическим и физическим лицам, имеющим о нем сведения, сообщить их суду Октябрьского района г. Могилева (г. Могилев, ул. Добролюбова, 2) в течение двух месяцев со дня публикации письменно или по телефону (80222) 33 29 56.

В суд Кобринского района поступило заявление об объявлении гражданина КЛАЧКОВИЧА Юрия Александровича умершим, с просьбой ко всем гражданам и юридическим лицам, имеющим сведения о гражданине Клачковиче Юрии Александровиче, 1969 года рождения, уроженца Малоритского района Брестской области, последнее известное место жительства — Республика Беларусь, Брестская область, г. Кобрин, ул. Советская, д. 123, кв. 113, местонахождение которого неизвестно, в отношении которого ставится вопрос об объявлении его умершим, с предложением в течение двух месяцев с момента публикации сообщить о данном гражданине имеющиеся сведения в суд Кобринского района Брестской области Республики Беларусь.

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Коралл» (продавец) извещает о проведении 13 ноября 2013 года открытого повторного аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, кабинет 2-8

№ лота	Наименование	Адрес объектов	Начальная цена продажи объекта, с учетом НДС, бел. руб.	Задаток, с учетом НДС, бел. руб.
1	Капитальное строение (здание кислородно-компрессорной станции), инв. № 350/С-44942, пл. 3903,6 кв.м. Земельный участок 340100000002003186 площадью 0,7976 га	г. Гомель, ул. Лепешинского, 7	908 113 500	45 405 675
2	Изолированное нежилое помещение (здание главного корпуса) инв. № 350/D-149240 пл. 52440,4 кв.м, галерея между главным и стекольным корпусом пл. 326,5 кв.м, навес железобетонный пл. 350,5 кв.м. Земельный участок под объект продажи будет выделен по заявке нового собственника, согласно законодательству РБ		29 499 000 000	1 474 950 000
3	Незавершенное законсервированное капитальное строение (выносная камера кондиционирования) инв. № 350/U-129007 пл. 800,4 кв.м. Земельный участок 340100000002003190 площадью 0,8532 га		1 234 600 000	61 730 000

Продавец: Открытое акционерное общество «Коралл». 8044 4574730
Шаг аукционных торгов – 5%.
Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет продавца (ОАО «КОРАЛЛ») № 3012111889019 в Региональной Дирекции № 300 ОАО «БПС-Сбербанк», УНП 400051785, МФО 153001369 **по 11 ноября 2013 года в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.**

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: **ул. Гагарина, 20, каб. 2-8, г. Гомель в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 от даты опубликования настоящего извещения. Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 11 ноября 2013 г. в 17.00.** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, объекты аукциона (имущество продается одним лотом) продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%. Организатор торгов может отказаться от их проведения за 3 дня до даты проведения торгов.

Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается продавцом в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

